Галоўнае ўпраўленне адукацыі Гомельскага аблвыканкама

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі”

# Фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры з дапамогай сучасных тэхналогій і метадаў навучання



Матэрыялы абласнога семінара

Гомель
2025

**Удзельнікі семінара:** метадысты устаноў (арганізацый), якія ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі, кіраўнікі ВМА, настаўнікі беларускай мовы і літаратуры

**Дата правядзення:** 13 лістапада 2025 года

**Месца правядзення**: ДУА "Сярэдняя школа №12 г.Светлагорска імя І.Р.Катлярова"

**Форма правядзення:** семінар-практыкум

**Мэта:** удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці педагагічных работнікаў у фарміраванні функцыянальнай пісьменнасці навучэнцаў на ўроках беларускай мовы і літаратуры з дапамогай сучасных тэхналогій і метадаў навучання

**Задачы:**
стварыць умовы для засваення педагогамі актуальных для сістэмы адукацыі вобласці праблем арганізацыі адукацыйнага працэсу па беларускай мове і літаратуры і вызначэння шляхоў і рэзерваў іх пераадольвання;
актуалізаваць веды педагагічных работнікаў аб сутнасці функцыянальнай пісьменнасці і шляхах яе фарміравання;
пашырыць уяўленні педагогаў аб выкарыстанні сучасных тэхналогій і метадаў навучання на ўроках беларускай мовы і літаратуры;
прадэманстраваць прадуктыўны педагагічны вопыт выкарыстання ў адукацыйным працэсе эфектыўных метадаў, сродкаў і форм навучання, якія садзейнічаюць фарміраванню функцыянальнай пісьменнасці навучэнцаў, выхаванню і развіццю іх асобы.

**Парадак правядзення семінара**

| | | |
|---|---|---|
| **9.00 – 10.00** | **Рэгістрацыя ўдзельнікаў семінара** | |
| фае 1-га паверха | *Русакова Ірына Сяргееўна* | *намеснік дырэктара ДУА "Сярэдняя школа №12 г.Светлагорска імя І.Р.Катлярова"* |
| **10.00 – 10.30** І паверх | **Галерэя вопыту настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры Светлагорскага раёна "Грані педагагічнай эрудыцыі" (вынікі раённага праекта для настаўнікаў)** | |
| | *Новік Вольга Васільеўна* | *метадыст вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУ "Светлагорскі раённы вучэбна-метадычны кабінет"* |
| | **Старонкі дасягненняў вучняў па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура" "Сузор'е талентаў" (вынікі раённага праекта)** | |
| | *Бусел Марына Аляксандраўна* | *намеснік дырэктара ДУА "Сярэдня школа №1 г.Светлагорска",* |

| | | |
|---|---|---|
| | | *настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі* |
| | **Відэарад “Гучыць беларускае слова”** | |
| | *Хоміч Таццяна Уладзіміраўна* | *настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА “Гімназія г.Светлагорска”* |
| | **Міні-прадстаўленне ў школьным музеі “Не зыч ліха другому”** | |
| | *Паўлюкова Алена Дзмітрыеўна* | *бібліятэкар ДУА “Сярэдняя школа №12 г.Светлагорска імя І.Р.Катлярова”* |
| | **Знаёмства з музейнай экспазіцыяй “И.Г.Котляров – Человек на все времена”, прысвечанай паэту, публіцысту, журналісту, перакладчыку і грамадскаму дзеячу, чыё імя носіць школа** | |
| | *Доўгая Крысціна, Віктараўна* | *загадчык музейнай экспазіцыі, нстаўнік рускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА “Сярэдняя школа №12 г.Светлагорска імя І.Р.Катлярова”* |
| **10.30 – 10.45** І паверх, відэасалон | **Адкрыццё семінара** | |
| | *Мінчукова Ларыса Фёдараўна* | *начальнік вучэбна-метадычнага аддзела гуманітарных дысцыплін дзяржаўнай установы адукацыі “Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі” (далей – ГАІРА)* |
| **10.45 – 11.00** І паверх, відэасалон | **Удасканаленне прадметна-метадычных кампетэнцый педагога як неабходная ўмова павышэння якасці адукацыйнага працэсу па беларускай мове і літаратуры** | |
| | *Скоблік Дар’я Анатольеўна* | *метадыст вучэбна-метадычнага аддзела гуманітарных дысцыплін ГАІРА* |
| **11.00 – 11.10** І паверх, відэасалон | **Адукацыйная прастора Светлагорскага раёна: стварэнне эфектыўнага адукацыйнага асяроддзя (фільм)** | |
| | *Чэркас Жанна Васільеўна* | *начальнік аддзела адукацыі Светлагорскага раённага выканаўчага камітэта* |
| **11.10 – 11.55** каб. № 2-19 1 група | **Урок беларускай мовы ў 5 класе па тэме “Неразвітыя і развітыя сказы”** | |
| | *Шабетнік Любоў Анатольеўна* | *настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай* |

| | | |
|---|---|---|
| | | *кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА “Сярэдняя школа №12 г.Светлагорска імя І.Р.Катлярова”* |
| **11.10 – 11.55**<br>каб. №2-21<br>2 група | **Урок беларускай літаратуры ў 5 класе па тэме «Падагульненне вывучанага па раздзеле “Вусная народная творчасць”»** | |
| | *Сікорская Юлія Уладзіміраўна* | *настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА “Сярэдняя школа №12 г.Светлагорска імя І.Р.Катлярова”* |
| **11.55 – 12.35**<br>каб. №2-20 | **Майстар-клас “Ад візуалізацыі да рэальнага дзеяння: як прыёмы візуалізацыі развіваюць навыкі функцыянальнай пісьменнасці на ўроках беларускай мовы”** | |
| | *Лучыновіч Марына Віктараўна* | *настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА “Сярэдняя школа №12 г.Светлагорска імя І.Р.Катлярова”;* |
| | *Рабок Ірына Іванаўна* | *настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА “Сярэдняя школа №12 г.Светлагорска імя І.Р.Катлярова”* |
| **12.35 – 13.15**<br>каб.№2-19 | **Майстар-клас “Медыяграматнасць як неад’емны фактар развіцця метадалагічнай культуры вучняў”** | |
| | *Лупсякова Анастасія Сяргееўна* | *настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА “Сярэдняя школа №13 г.Жлобіна імя В.В.Гузава”* |
| **13.15 – 13.55**<br>каб№2-20 | **Майстар-клас “Работа з тэкстам як асноўны спосаб фарміравання чытацкай пісьменнасці вучняў”** | |
| | *Еўстраценка Людміла Віктараўна* | *настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА “Гімназія г.Чачэрска”* |
| **13.55 – 14.15**<br>каб.№2-21 | **Саюз аднадумцаў “Новыя прафесійныя магчымасці з анлайн-школай для філолагаў”** | |
| | *Купрацэвіч Вольга Васільеўна* | *кіраўнік раённай анлайн-школы для філолагаў, настаўнік рускай мовы вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ДУА “Сярэдняя школа №11 г.Светлагорска”* |

| | | |
|---|---|---|
| **14.15 – 14.30** | **Падвядзенне вынікаў семінара. Абмен думкамі**<br>*Мінчукова Ларыса Фёдараўна* | <br>*начальнік вучэбна-метадычнага аддзела гуманітарных дысцыплін ГАІРА* |
| **14.30 – 15.00** | **Абед** | |
| **15.00** | **Ад’езд удзельнікаў семінара** | |

**Галерэя вопыту настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры Светлагорскага раёна “Грані педагагічнай эрудыцыі”. Старонкі дасягненняў вучняў па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” “Сузор’е талентаў”**

*Новік В.В., метадыст ДУ “Светлагорскі раённы вучэбна-метадычны кабінет”;*
*Бусел М.А., наменнік дырэктара, настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА “Сярэдняя школа №1 г.Светлагорска”*

Матэрыялы прадстаўлены ў прэзентацыі: https://drive.google.com/file/d/1ReLFCtkuP9Em5VNARDojuV3c7kTwS3dS/view?usp=sharing

**Фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры з дапамогай сучасных тэхналогій і метадаў навучання**

*Мінчукова Л.Ф., начальнік вучэбна-метадычнага аддзела гуманітарных дысцыплін ДУА «Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі»*

Матэрыялы прадстаўлены ў прэзентацыі: https://drive.google.com/file/d/1IRNrMn0xaJaTcLzxhh-KRYVISSzGFkUh/view?usp=sharing

**Удасканаленне прадметна-метадычных кампетэнцый педагога як неабходная ўмова павышэння якасці адукацыйнага працэсу па беларускай мове і літаратуры**

*Скоблік Д.А.,*
*метадыст вучэбна-метадычнага аддзела гуманітарных дысцыплін ДУА «Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі»*

Якаснае кіраванне прафесійным ростам педагога спрыяе павышэнню эфектыўнасці адукацыйнага працэсу. Прааналізуем колькасны і якасны саставы настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры вобласці.




Адукацыйны працэс па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” згодна дадзеным уліку педагагічных кадраў вобласці па стане на кастрычнік 2025 года забяспечваюць 1105 настаўнікаў. 27 з іх – сумяшчальнікі.




Для 1105 настаўнікаў вучэбныя прадметы “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” з’яўляюцца асноўнымі. Разгледзем іх кваліфікацыйны ўзровень.

86,23% настаўнікаў маюць кваліфікацыйныя катэгорыі “настаўнік-метадыст”, вышэйшую і першую кваліфікацыйныя катэгорыі. Гэта лепшы паказчык за апошнія 5 гадоў. Станоўчая дынаміка павышэння кваліфікацыйнага ўзроўню педагогаў назіраецца ва ўсіх раёнах вобласці. Адбываецца павелічэнне колькасці настаўнікаў з кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст”.




Гэтай катэгорыі ўдастоены 504 педагогаў рэспублікі, 72 з іх – у Гомельскай вобласці. У параўнанні з іншымі рэгіёнамі рэспублікі мы маем лепшы вынік: з 43 настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры гэтай кваліфікацыйнай катэгорыі ўсёй рэспублікі – 9 з Гомельскай вобласці.







Гэта Жгарова Валянціна Мікалаеўна, Панякова Ірына Іванаўна, Казачэнка Ірына Рыгораўна, Паляшчук Аксана Мікалаеўна, Мігаль Алена Генадзьеўна, Яраш Таццяна Леанідаўна, Яўсеенка Ірына Віктараўна, Смарцэлава Наталія Дзмітрыеўна, Есіс Яўген Валер’евіч, якія прадстаўляюць 5 раёнаў вобласці і горад Гомель.

Іх вопыт трэба выкарыстоўваць для падрыхтоўкі педагогаў, якія могуць прэтэндаваць на прысваенне вышэйшай, першай і другой кваліфікацыйных катэгорый. У гэтым напрамку дзейнасці ў параўнанні з 2021 годам назіраецца станоўчая дынаміка, аднак па стане на пачатак 2024/2025 навучальнага года, як і раней, мы маем вялікую колькасць педагогаў, якія не выкарыстоўваюць права павышэння кваліфікацыйнага ўзроўню. У кастрычніку 2025 года гэта лічба склала 331, крыху болей за 29,9% ад агульнай колькасці настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры нашай вобласці.




На працягу кожнага навучальнага года ад устаноў адукацыі вобласці пасупаюць накірункі на здачу кваліфікацыйнага экзамена пры праходжанні атэстацыі на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі.




На базе інстытута і раёнаў, у Акадэміі адукацыі за апошнія 6 навучальных гадоў 510 настаўнікаў пасяхова здалі экзамен на вышэйшую катэгорыю. Можна назваць актыўным удзел раёнаў у гэтым, так як рэзерв на пачатак навучальнага года складае колькасць – 245 настаўнікаў.



За мінулы навучальны год 17 педагогаў прымалі ўдзел у экзаменах, для 11 з якіх ён быў выніковым. Акцябрскі, Чачэрскі, Рэчыцкі, Рагачоўскі, Жлобінскі, Калінкавіцкі, Гомельскі раёны, Навабеліцкі, Чыгуначны раёны г.Гомеля забяспечылі якасны ўдзел настаўнікаў рэзерва ў экзаменах. 5 раёнаў вобласці: Брагінскі, Жыткавіцкі, Кармянскі, Рэчыцкі – накіравалі настаўнікаў, але яны не змаглі здаць экзамен на вышэйшую катэгорыю. Не накіроўвалі настаўнікаў на здачу экзамена Буда-Кашалёўскі, Веткаўскі, Добрушскі, Ельскі, Лельчыцкі, Лоеўскі, Мазырскі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі, Светлагорскі, Хойніцкі раёны, Цэнтральны і Савецкі раёны г.Гомеля.




Лічым неабходным забяспечыць сістэмнасць у рабоце па падрыхтоўцы настаўнікаў да ўсіх этапаў атэстацыі. Мэтазгодна арганізаваць трансляцыю вопыта педагогаў, якія паспяхова прайшлі атэстацыю, прапанаваць ім падзяліцца ўражаннямі аб экзамене, расказаць аб заданнях, заўвагах камісіі і г.д. Карысным будзе правядзенне практычных заняткаў па складанні метадычных распрацовак урокаў, абагульненні асабістага педагагічнага вопыту.

Задача метадычных служб заключаецца яшчэ і ў тым, каб садзейнічаць засваенню педагогамі зместа нарматыўных прававых дакументаў і інструктыўна-метадычных матэрыялаў, актуалізацыі ведаў па вучэбных прадметах. Гэта таксама лепш рабіць у практычнай форме.

Для забяспечання практычнай падрыхтоўкі педагогаў раім выкарыстоўваць матэрыялы сайта інстытута. Праз радок меню трэба перайсці ў раздзел “Атэстацыя”, у якім выбраць падраздзел “Кваліфікацыйны экзамен”.

Тут размешчана спецыфікацыя білета. У адпаведнасці з ёй распрацоўваюцца білеты да экзаменаў. Праходжанне пробнага тэсціравання дазваляе не толькі атрымаць уяўленні аб змесце заданняў экзамена, але і выявіць прабелы ў сваіх ведах.

Комплекснае суправаджэнне падрыхтоўкі настаўнікаў у перыяд атэстацыі спрыяе не толькі станоўчаму яе праходжанню, а і навогул, павышэнню якасці адукацыйнага працэсу. Разгледзім асноўныя паказчыкі якасці адукацыі.

Пачнем з вынікаў цэнтралізаванага экзамена 2025 года.

Сярэдні рэспубліканскі бал па беларускай мове склаў 65,6. Сярэдні абласны бал па беларускай мове склаў 64,24. Гэта на 3,2 бала вышэй за сярэдні абласны бал па ўсіх прадметах (сярэдні абласны бал па ўсіх прадметах склаў 61,04).







У 2025 годзе ўладальнікамі 100-бальных сертыфікатаў па беларускай мове сталі 35 удзельнікаў ЦЭ Гомельскай вобласці. Стобальнікаў па рэспубліцы –264.

Добрасумленная плённая праца і правільнае, граматнае супрацоўніцтва з вучнямі і іх законнымі прадстаўнікамі даюць магчымасць тым, хто насамрэч сур’ёзна і мэтанакіравана рыхтуецца да ЦТ.




Для павышэння вынікаў цэнтралізванага экзамена лічым мэтазгодным:

садзейнічаць удасканаленню кантрольна-ацэначнай дзейнасці настаўнікаў і забяспечыць аб’ектыўнасць ацэньвання навучэнцаў. Гэта дазволіць пазбегнуць сітуацый, калі вучань мае больш высокі за яго рэальныя веды бал і вырашае рызыкнуць і пайсці на ЦЭ;

неабходна забяспечыць сістэмнаць і бесперапыннасць у падрыхтоўцы навучэнцаў да ЦЭ;

з улікам рэкамендацый па выніках ЦЭ трэба праводзіць шэраг метадычных мерапрыемтсваў на базе ўстаноў раёна, а таксама арганізоўваць

дзелавую гульню, аналагічную дыягнастычнаму тэсціраванню, якая ўжо двойчы праводзілася для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры вобласці;

абавязковай умовай лічым забеспячэнне ўдзелу вучняў у рэпетыцыйным тэсціраванні і зрэз-тэстах.

Немалаважным паказчыкам якасці ведаў вучняў з’яўляецца выніковы ўдзел у алімпіядным руху. Вынікі выступлення навучэнцаў Гомельскай вобласці на заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры за апошнія 7 гадоў прадстаўлены на слайдзе:


Вынікі заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды

| Раён, установа | 2019 | 2020 | 2021 | 2022 | 2023 | 2024 | 2025 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Акцябрскі | 1 | | 2 | | | | |
| Брагінскі | | | | | 1 | | |
| Жлобінскі | | | | | 2 | 1 | |
| Навабеліцкі | | | | | | | 1 |
| Лоеўскі | | | | | 1 | 1 | |
| Мазырскі | 1 | | 2 | 2 | 1 | 1 | |
| г.Гомель | 1 | | | | | | |
| Рагачоўскі | | | | | 1 | 2 | |
| Рэчыцкі | | | 1 | | | | |
| Савецкі | 1 | 2 | | 1 | 4 | 3 | 2 |
| Светлагорскі | | | 1 | 1 | | 1 | 3 |
| Цэнтральны | | | 3 | 2 | 1 | | 1 |
| ГДАЛ | | | 1 | 1 | | | |
| МДАЛ | | | 1 | | | 1 | |

Выніковую работу ў гэтым накірунку паказваюць 6 раёнаў вобласці: Акцябрскі, Жлобінскі, Лоеўскі, Мазырскі, Рагачоўскі, Светлагорскі раёны, Савецкі, Цэнтральны раёны г.Гомеля і абласныя ліцэі.


Вынікі заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды

| Установа адукацыі | 2021 | 2022 | 2023 | 2024 | 2025 |
|---|---|---|---|---|---|
| Гімназія №10 г.Гомеля | 1 | | | | |
| Гімназія №58 г.Гомеля імя Ф.П.Гааза<br>Гімназія імя Я.Купалы г.Мазыра | | | | 1<br>1 | 1 |
| Гімназія №51 г.Гомеля | | 1 | 2 | 1 | 1 |
| Гімназія №56 г.Гомеля імя А.А.Вішнеўскага | 2 | 2 | | | |
| Гімназія №71 г.Гомеля | | | 1 | | |
| Акцябрская раённая гімназія | 2 | | | | |
| Гімназія №1 г.Жлобіна | | | 1 | | |
| Гімназія г.Светлагорска | | 1 | | | |
| ГДАЛ | 1 | 1 | | | |
| МДАЛ | 1 | | | 1 | |

Пераможцаў заключнага этапу ў апошнія 5 год падрыхтавалі настаўнікі дзевяці гімназій: 10, 51, 56, 58 і 71 г.Гомеля, Акцябрскай раённай гімназіі, гімназіі №1 г.Жлобіна, гімназіі г.Светлагорска, гімназіі імя Я.Купалы г.Мазыра і абласных ліцэяў.

Па выніках III этапа рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры стабільна дыпломы атрымоўваюць вучні Светлагорскага, Жлобінскага, Мазырскага, Акцябрскага, Жыткавіцкага, Лоеўскага, Ельскага, Калінкавіцкага, Рагачоўскага раёнаў, Савецкага, Цэнтральнага і Чыгуначнага раёнаў Гомеля.



**Вынікі трэцяга этапу рэспубліканскай алімпіяды**

Стабільныя вынікі

| Раён, установа | 2023 | 2024 | 2025 |
|---|---|---|---|
| Савецкі | 9 | 8 | 5 |
| Светлагорскі | 4 | 4 | 4 |
| Жлобінскі | 6 | 5 | 4 |
| Цэнтральны | 3 | 2 | 3 |
| Мазырскі | 4 | 4 | 3 |
| Акцябрскі | 2 | 1 | 1 |
| Жыткавіцкі | 1 | 1 | 1 |
| Лоеўскі | 2 | 1 | 1 |
| Чыгуначны | 2 | 4 | 3 |
| Ельскі | 2 | 1 | 2 |
| Калінкавіцкі | 1 | 2 | 3 |
| Рагачоўскі | 2 | 2 | 2 |

Нестабільныя вынікі

| Раён, установа | 2023 | 2024 | 2025 |
|---|---|---|---|
| Рэчыцкі | | | 1 |
| Лельчыцкі | 1 | | 1 |
| Брагінскі | 3 | 2 | |
| МДАЛ | | 1 | 1 |
| Петрыкаўскі | 1 | | 1 |
| ГДАЛ | 2 | 1 | |
| Добрушскі | 2 | 2 | |
| Гомельскі | 1 | | 1 |
| Навабеліцкі | 1 | | 1 |
| Нараўлянскі | | 1 | 2 |



За кожным пераможцам стаіць настаўнік, раённы трэнер, якія вучаць, падтрымліваюць, дапамагаюць атрымаць перамогу, нават у рабоце над сабой.

Астатнія 7 раёнаў вобласці, Навабеліцкі раён г.Гомеля, а таксама Мазырскі дзяржаўны абласны ліцэй, Гомельскі абласны ліцэй маюць нестабільныя вынікі.

На працягу апошніх трох гадоў не маюць пераможцаў на III этапе рэспубліканскай алімпіяды Кармянскі, Веткаўскі, Хойніцкі, Чачэрскі, Буда-Кашалёўскі раёны, установы падпарадкавання ўпраўлення адукацыі Гомельскага гарвыканкама, Гомельскае кадэцкае вучылішча.

Аналізуючы ўдзел у абласной алімпіядзе 4-9 класаў за 3 апошнія гады, хочацца адзначыць выніковую работу Лельчыцкага, Чачэрскага, Жлобінскага, Петрыкаўскага, Мазырскага, Светлагорскага, Акцябрскага, Рэчыцкага раёнаў, Савецкага, Цэнтральнага, Навабеліцкага, Чыгуначнага раёнаў г.Гомеля. Колькасць дыпломаў гэтых раёнаў вагаецца ад 1 да 11. Лельчыцкі раён на працягу трох гадоў стабільна мае 1 дыплом.



**Вынікі абласной алімпіяды вучняў 4-9 класаў**

Стабільныя вынікі

| Раён | 2023 | 2024 | 2025 |
|---|---|---|---|
| Лельчыцкі | 1 | 1 | 1 |
| Чачэрскі | 1 | 2 | 2 |
| Жлобінскі | 5 | 5 | 4 |
| Цэнтральны | 3 | 1 | 3 |
| Навабеліцкі | 2 | 2 | 1 |
| Петрыкаўскі | 2 | 1 | 1 |

| Раён | 2023 | 2024 | 2025 |
|---|---|---|---|
| Мазырскі | 8 | 6 | 5 |
| Савецкі | 4 | 10 | 11 |
| Светлагорскі | 3 | 7 | 8 |
| Чыгуначны | 4 | 3 | 3 |
| Акцябрскі | 2 | 2 | 2 |
| Рэчыцкі | 1 | 3 | 3 |

Нестабільныя вынікі

| Раён | 2023 | 2024 | 2025 |
|---|---|---|---|
| Ельскі | 1 | | |
| Нараўлянскі | 1 | 1 | |
| Добрушскі | 1 | 1 | |
| Веткаўскі | | | 1 |
| Рагачоўскі | 1 | 3 | |
| Гомельскі | | 3 | 1 |
| Жыткавіцкі | | 2 | |
| Кармянскі | | | 1 |
| Калінкавіцкі | 1 | | 2 |
| Лоеўскі | | | 2 |
| г.Гомель (падведамасныя) | | | 2 |
| Брагінскі | 2 | | 2 |



Веткаўскі, Гомельскі, Кармянскі раёны ў 2024/2025 навучальным годзе змаглі атрымаць па аднаму дыплому, што сведчыць пра нестабільныя вынікі. Ельскі, Нараўлянскі, Добрушскі, Рагачоўскі, Жыткавіцкі, Калінкавіцкі, Лоеўскі, г.Гомель (падведамасныя), Брагінскі раёны таксама маюць нестабільныя вынікі.

Буда-Кашалёўскі і Хойніцкі раёны, Гомельскае кадэцкае вучылішча не маюць пераможцаў 3 апошнія гады правядзення алімпіяды.




Стабільнасць вынікаў адразу ў рэспубліканскай і абласной алімпіядзе дэманструюць Лельчыцкі, Чачэрскі, Жлобінскі, Петрыкаўскі, Мазырскі, Светлагорскі, Акцябрскі, Рэчыцкі раёны, Цэнтральны, Навабеліцкі, Савецкі і Чыгуначны раёны г.Гомеля. Астатнія раёны вобласці дэманструюць папераменныя поспехі.

Няма ні аднаго пераможцы за 5 апошніх гадоў на 3-м этапе рэспубліканскай алімпіяды і на абласной алімпіядзе ў Буда-Кашалёўскім і Хойніцкім раёнах, Гомельскім кадэцкім вучылішчы.




Алімпіядны рух патрабуе сістэмнай работы з улікам пераемнасці, пачынаючы ўжо з пачатковых класаў. Важна берагчы і падтрымліваць цікавасць дзіцяці да вывучэння прадмета і да ўдзела ў алімпіядным руху. Для гэтага неабходна тлумачыць самім вучням, іх бацькам тыя станоўчыя моманты, якія атрымлівае пераможца 3-га і заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды. 10 балаў у атэстаце, 100-бальны сертыфікат і льготы пры паступленіі ва ўстановы вышэйшай адукацыі варты таго, каб удзельнічаць у алімпіядзе.

Для падтрымкі цікавасці да вывучэння роднай мовы і літаратуры ва ўстанове адукацыі павінна быць створана такая сістэма работы, калі мерапрыемствы праводзяцца не толькі ў межах прадметнага тыдня, а на працягу ўсяго года з абавязковым удзелам алімпіяднікаў.

Добрай падрыхтоўкай да рэспубліканскай алімпіяды з’яўляецца ўдзел у абласных конкурсах.


Абласны конкурс рытарычнага майстэрства «Ведай родную мову»

Маюць пераможцаў штогадова

| Раён | 2023 | 2024 | 2025 |
|---|---|---|---|
| Акцябрскі | 1 | 1 | 1 |
| Мазырскі | 2 | 2 | 3 |
| Савецкі | 6 | 5 | 4 |
| Цэнтральны | 2 | 1 | 1 |
| Жлобінскі | 1 | 2 | 3 |
| Лоеўскі | 1 | 1 | 1 |
| Светлагорскі | 3 | 3 | 2 |

двойчы

| Раён, установа | 2023 | 2024 | 2025 |
|---|---|---|---|
| Брагінскі | 3 | 2 | |
| Рэчыцкі | | 1 | 1 |
| Чыгуначны | | 1 | 2 |
| Навабеліцкі | | 1 | 1 |
| Нараўлянскі | | 1 | 1 |
| МДАЛ | | 1 | 2 |

аднойчы

| Раён | 2023 | 2024 | 2025 |
|---|---|---|---|
| Петрыкаўскі | | | 1 |
| Рагачоўскі | | 1 | |
| Жыткавіцкі | | | 1 |
| Калінкавіцкі | | | 1 |
| ГДАЛ | | | 1 |

Не маюць пераможцаў

Буда-Кашалёўскі, Веткаўскі,Гомельскі, Ельскі, Добрушскі, Чачэрскі, Кармянскі, Лельчыцкі, Хойніцкі, г.Гомель (падведамасныя), ГКВ

У перыяд трэніровачных збораў праводзіцца лінгвістычны конкурс па беларускай мове і літаратуры “Ведай родную мову.” Гэты конкурс ставіць на мэце падрыхтоўку вучняў да лінгвістычнага этапу алімпіяды (напісанне водгуку). Апошнія два гады ў конкурсе могуць прымаць удзел пераможцы III этапу рэспубліканскай алімпіяды.

За перыяд існавання конкурсу становіцца зразумела, што ў шэрагу раёнаў пры падрыхтоўцы вучняў да алімпіяды настаўнікі недастаткова ўвагі надаюць навучанню алімпіяднікаў напісанню водгука, таму па конкурсным заданні “напісанне міні-сачынення” атрымліваюць вельмі нізкія балы, што не дазволіла ні ў адзін год атрымаць дыплом пераможцы.

Штогод пераможцамі конкурсу з’яўляюцца прадстаўнікі Акцябрскага, Мазырскага, Жлобінскага, Лоеўскага, Светлагорскага раёнаў, Савецкага і Цэнтральнага раёнаў г.Гомеля.


Абласны конкурс рытарычнага майстэрства "Гавары са мной па-беларуску"

Маюць пераможцаў

| Раён | 2022 | 2023 | 2024 |
|---|---|---|---|
| ГДАЛ | 1 | 1 | 1 |
| Жлобінскі | 2 | 3 | 3 |
| Калінкавіцкі | 1 | 2 | 1 |
| Светлагорскі | 3 | 3 | 2 |
| Навабеліцкі | 1 | 1 | 2 |
| Савецкі | 9 | 9 | 6 |
| Рэчыцкі | 1 | 2 | 2 |
| Нараўлянскі | 1 | | 1 |
| Мазырскі | 2 | | 2 |
| Цэнтральны | 1 | 2 | |

| Раён, установа | 2022 | 2023 | 2024 |
|---|---|---|---|
| Брагінскі | 2 | 3 | |
| Добрушскі | 1 | | |
| г.Гомель [illegible] | | 1 | |
| Гомельскі | 1 | | |
| Ельскі | 2 | | |
| Кармянскі | 1 | | |
| Лоеўскі | 1 | 1 | |
| МДАЛ | | 1 | 1 |

| Раён | 2022 | 2023 | 2024 |
|---|---|---|---|
| Акцябрскі | | 1 | 1 |
| Веткаўскі | | | 1 |
| Петрыкаўскі | | 1 | 2 |
| Рагачоўскі | | 1 | |
| Чыгуначны | | 2 | 3 |

Не маюць пераможцаў

| |
|---|
| Буда-Кашалёўскі |
| ГКВ |
| Жыткавіцкі |
| Хойніцкі |
| Чачэрскі |
| Лельчыцкі |

Абласны конкурс рытарычнага майстэрства “Гавары са мной па-беларуску” праводзіцца з мэтай развіцця інтэлектуальнага патэнцыялу навучэнцаў, павышэння агульнага культурнага ўзроўню гаварэння,

фарміравання ў навучэнцаў спецыяльных камунікатыўных уменняў і навыкаў, выяўлення здольных і лінгвістычна адораных дзяцей. У конкурсе прымаюць удзел навучэнцы IX-XI класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з ліку пераможцаў II этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах “Беларуская мова”, “Беларуская літаратура”.

7 раёнаў і ўстановы адукацыі г.Гомеля, абласны ліцэй маюць пераможцаў штогадова. А гэта сведчыць аб сістэмным падыходзе ў падрыхтоўцы да алімпіяд.

Навукова-практычнай канферэнцыі навучэнцаў па прыродазнаўчых і сацыяльна-гуманітарных накірунках “Пошук”.




Выніковым на працягу сямі гадоў у секцы ”Лінгвістыка” быў удзел у канферэнцыі юных даследчыкаў з Савецкага раёна, 3 апошнія гады – Жлобінскі раён, на працягу з 2019 па 2025 г – 5 разоў Светлагорскі раён, двойчы – Жыткавіцкі, Акцябрскі, Рэчыцкі, Мазырскі раёны, Цэнтральны раён г.Гомеля. Прадстаўнікі астатніх раёнаў перамагалі толькі 1 раз.




У секцыі “Літаратуразнаўства” штогадова пераможцамі станавіліся юныя даследчыкі Савецкага раёна, чатыры разы – Светлагорскага раёна, двойчы –

Жлобінскага, Жыткавіцкага, Лельчыцкага, Ельскага раёнаў, Цэнтральнаг раёна г.Гомеля.

Прадстаўнікі астатніх раёнаў заваёўвалі перамогу толькі аднойчы.




Ні разу за 6 гадоў ні ў адной з секцый не змаглі атрымаць дыплом пераможцы прадстаўнікі Брагінскага, Буда-Кашалёўскага, Добрушскага, Лоеўскага, Нараўлянскага, Петрыкаўскага раёнаў, установ падпарадкавання ўпраўлення адукацыі Гомельскага гарвыканкама, абласнога ліцэя, Гомельскага кадэцкага вучылішча. Як правіла, іх работы насілі рэфератыўны характар, не адказвалі патрабаванням да афармлення вынікаў даследавання, мелі невысокі ўзровень унікальнасці работ, мелі неактуальную тэматыку.

Пры падрыхтоўцы навучэнцаў да ўдзелу ў рэспубліканскім конкурсе работ даследчага характару кансультатыўную дапамогу аказваюць супрацоўнікі ГАІРА і выкладчыкі ўніверсітэта імя Ф.Скарыны. Паэтапна праводзяцца трэніровачныя зборы па падрыхтоўцы да конкурсу. Гэта заўсёды прыносіць свае вынікі. Такая мадэль падрыхтоўкі вучняў можа быць выкарыстана ў раёнах пры падрыхтоўцы да абласной канферэнцыі “Пошук”. Звяртаем увагу на неабходнасць адбору работ строга ў адпаведнасці з парадкам работы секцый “Лінгвістыка” ці “Літаратуразнаўства”, размешчаных у якасці дадатка да палажэння аб канферэнцыі.

Паважаныя калегі! Менавіта ад кожнага з нас залежыць паспяховасць кожнага вучня, выніковасць адукацыйнага працэсу па беларускай мове і літаратуры. Вы з’яўляецеся той кіруючай сілай, якая захапляе, вядзе за сабой, адраджае гонар і самасвядомасць маладога пакалення, прывівае любоў да матчынай мовы.

# УРОК БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў 5 КЛАСЕ

Шабетнік Любоў Анатольеўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА “Сярэдняя школа №12 г.Светлагорска імя І.Р.Катлярова”

Тэма: Развітыя і неразвітыя сказы.

Тып урока: урок замацавання ведаў і развіцця навыкаў і ўменняў.

Мэта ўрока: стварэнне ўмоў для фарміравання ведаў пра будову простага неразвітага і развітага сказаў.

Задачы ўрока: выпрацоўваць уменні адрозніваць развітыя і неразвітыя сказы ў тэкстах, дапаўняць неразвітыя сказы дадзенымі членамі, выяўляць ролю неразвітых і развітых сказаў у маўленні;

развіваць граматычны лад маўлення вучняў, вучыць асэнсавана ўжываць неразвітыя і развітыя сказы ва ўласных выказваннях;

садзейнічаць выхаванню цікавасці да роднага слова, любові да роднай прыроды.

Абсталяванне: падручнікі, слоўнікі, раздатачны матэрыял, мультымедыя, слоўнікі.

Ход урока

I. Матывацыйна-арганізацыйны этап:

1.Арганізацыйны момант

- Добры дзень усім прысутным. Рада вітаць вас на ўроку роднай мовы. Сядайце, калі ласка! Скажыце, калі ласка, якая пара года гаспадарыць за акном?(восень) Чым нашы продкі займаліся восенню? (працавалі) Так. Восенню нашы продкі многа працавалі, а каб праца была плённай, лёгкай і цікавай яны працавалі талакой. А каб ім працавалася весялей яны спявалі песні, загадвалі загадкі, суправаджалі працу вуснай народнай творчасцю. Давайце вызначым лексічнае значэнне слова “талака”? (слова размешчана на дошцы, на экране карціна) (Тлумачэнне лексічнага значэння слова “талака” –сумесная праца; калектыўная работа пры выкананні сельскагаспадарчых работ. Пераноснае значэнне “група людзей”). Звярніце увагу на правапіс гэтага слова (літара о пішацца пад націскам). Каб наша праца была плённай мы таксама будзем з вамі працаваць разам і суправаджаць наш урок загадкамі, прыказкамі.

1. Паведамленне тэмы і мэты ўрока

- А плённа працаваць мы з вамі будзем па тэме “Неразвітыя і развітыя сказы” (звернем увагу на правільную пастаноўку націску). Запішыце, калі ласка, дату і тэму ўрока. Сёння мы працягнем разглядаць неразвітыя і развітыя сказы. Мы павінны навучыцца размяжоўваць неразвітыя і развітыя сказы, ствараць развітыя сказы на аснове неразвітых, выяўляць іх ролю ў маўленні.

**Мэтавызначэнне.**

- Дзеці, дапамажыце мне размеркаваць карткі: што мы ведаем, што ўмеем, чаму навучымся.(На дошцы размешчаны карткі ў хаатычным парадку.

Адзін вучань або некалькі па чарзе выходзяць да дошкі і размяшчаюць правільна)

**Ведаем:** галоўныя члены сказа, даданыя члены сказа, неразвітыя сказы, развітыя сказы.

**Умеем:** вызначаць галоўныя члены сказа, даданыя члены сказа.

**Навучымся:** складаць неразвітыя сказы, складаць развітыя сказы, знаходзіць у тэксце неразвітыя і развітыя сказы.

- Вось бачыце, колькі ў нас сёння работы на ўроку. Але я ўпэўнена, што мы справімся, бо як мы будзем працаваць? (разам і адзін аднаму дапамагаць).

2. Актуалізацыя ведаў.

- А засвоіць тэму нам дапамогуць веды, набытыя на папярэдніх уроках. Давайце іх узновім.

**Заданне 1**: Суаднясіце пачатак і канец сказа з двух слупкоў. (работа ў парах). Сказы размешчаныя на экране.

| | |
|---|---|
| **А.** Просты сказ – гэта сказ, у якім…<br>**Б**. Дзейнік - гэта галоўны член сказа, які …<br>**В.** Выказнік - гэта галоўны член сказа, які …<br>**Г.** Да даданых членаў сказа адносяцца …<br>**Д.** Азначэнне - гэта даданы член сказа, які …<br>**Е.** Дапаўненне - гэта даданы член сказа, які …<br>**Ё.** Акалічнасць – гэта даданы член сказа, які…<br>**Ж.** Развіты сказ – гэта сказ…<br>**З.** Неразвіты сказ – гэта сказ, які складаецца… | 1. азначэнне, дапаўненне, акалічнасць.<br>2. адна граматычная аснова<br>3. абазначае, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе, і адказвае на пытанні *хто? што?*<br>4. абазначае месца, час, прычыну, спосаб дзеяння і адказвае на пытанні дзе? куды? адкуль? калі? у які прамежак часу? чаму? па якой прычыне? як? якім чынам?<br>5. які мае галоўныя і даданыя члены сказа.<br>6. абазначае прымету прадмета і адказвае на пытанні *які? чый?*<br>7. абазначае прадмет і адказвае на пытанні каго? чаго? каму? чаму? кім? чым? аб кім? аб чым?.<br>8. абазначае, што гаворыцца пра дзейнік, і адказвае на пытанні *што робіць прадмет? хто такі прадмет? што такое прадмет? які прадмет?*<br>9. толькі з дзейніка і выказніка. |

*Агучванне вынікаў работы: А2, Б3,В8, Г1,Д6,Е7,Ё4, Ж5, З5*

- Вельмі добра! Узноўленыя веды абавязкова спатрэбяцца нам у далейшай працы.

II. Аперацыйна-пазнавальны этап:

- Сёння мы з вамі будзем гаварыць пра... А пра што мы будзем гаварыць, нам падкажа загадка.

Лісты рознакаляровыя сталі і з дрэў упалі. Значыць гэта да нас прыходзіць і дажджы з сабой прыносіць…? (восень)

- Так.Сёння мы будзем гаварыць пра восень.

- На сталах у вас ляжаць карткі з заданнямі. Давайце звернемся да **задання №2**. Адзін вучань ідзе да дошкі, астатнія працуюць у сшытках.

Запісаць сказы, падкрэсліць граматычную аснову. Назваць неразвіты і развіты сказы. Які сказ больш поўна апісвае прадмет?

**Спадцішка падкралася залатая восень. Ападае лісце.**

- Ці зразумела вам лексічнае значэнне слова “спадцішка”? Хто можа патлумачыць лексічнае значэнне слова? (Тлумачэнне лексічнага значэння слова. Работа з слоўнікам.) Падабраць сінонімы, запісаць. (**спадцішка – ціха, непрыкметна**)

- Малайцы! Справіліся з гэтым заданнем.

**Заданне 3.** Работа з тэкстам. Прачытайце тэкст. Дайце загаловак. Вызначце тып маўлення. Вызначце неразвітыя і развітыя сказы, запішыце, зрабіце сінтаксічны разбор. (вучань чытае заданне і тэкст)

(Надыход восені)

Скончана жніво. Ідзе абмалот збожжа. Спеюць яблыкі. У прыродзе адчуваецца набліжэнне восені. Сонечныя праменені ўжо не такія гарачыя.

Маладыя шпакі чародкамі пералятаюць з месца на месца. Яны рыхтуюцца ляцець у вырай. Рыхтуюцца да вялікага асенняга падарожжа чыжы і дразды. Бліжэй да сяла ціснуцца сініцы.

Адказы вучняў, тлумачэнне.

- Назавіце ў тэксце словы, да якіх можна прымяніць наступнае выказванне: “Акуратна, ад душы о,э пад націскам пішы”.

- Знайдзіце слова, да якога можна прымяніць выказванне :

“Вёсны – вясна!
Пасля мяккай зычнай пішам я:
У першым складзе перад націскам яна”

- А да якіх слоў можна прымяніць выказванне:

Ў (нескладовае) просіцца
Пасля галоснага стаць:
Правіла гэта ўсім вядомае-
Сябруе з галоснымі ў (нескладовае).

**Фізкультхвілінка. ( А цяпер давайце крышачку адпачнем!)**

Устаньце, дзеці, усміхніцеся,
Зямлі нашай пакланіцеся
За шчаслівы дзень учарашні.
Усе да сонца пацягніцеся,
Улева, управа нахіліцеся,
Верацёнцам пакруціцеся.
Раз прысядзьце
І за парты ціха сядзьце.

- Многія мастакі, пісьменнікі, кампазітары звярталіся ў сваіх творы да прыроды, менавіта да восені. Так пісьменнік Я.Колас у паэме “Новая зямля” вельмі прыгожа апісвае восень. **Давайце паслухаем урывак з паэмы**, з якім нас пазнаёміць Вікторыя. Калі ласка, Вікторыя. (урывак на памяць чытае загадзя падрыхтаваны вучань)

- Якуб Колас глыбока разумеў прыроду роднага краю, быў выключна назіральным і ўсё тое, што для іншых было непрыкметна, з любоўю перадаваў у сваіх творах.

- З такой жа любоўю адносіўся да прыроды і беларускі мастак Вітольд Бялыніцкі-Біруля, любімай парой года якога была вясна, але вартыя ўвагі і восеньскія работы пейзажыста. Давайце разгледзім яго карціны, прысвечаныя гэтым порам года і перабудуем неразвітыя сказы ў развітыя.

**Практыкаване 173.** Вучні разглядаюць карціны, іх назвы, вызначаюць, якія з назваў суадносяцца з неразвітымі сказамі. Пры дапамозе дадзеных членаў перабудоўваюць неразвітыя сказы ў развітыя адпаведна са зместам карціны і запісваюць сказы.

- Восень у госці да нас прыйшла і з сабой прынесла…?

Што? Скажыце наўздагад, ну вядома…( лістапад).

- На сталах у вас ляжаць рознакаляровыя лісты, з дапамогай якіх мы будзем правяраць **слыхавы дыктант**: а) чырвоны, б) жоўты, в) аранжавы. На сталах у вас ляжыць тры лісточкі, зараз нам спатрэбіцца два: чырвоны і жоўты. Я буду чытаць вам сказы, а вы, калі ласка, падымайце лісточкі. Калі сказ неразвіты, падымайце жоўты лісточак, калі развіты – чырвоны.

(Восень – найпрыгажэйшая пара. Неба апусцілася. Жывёлы рыхтуюцца да зімы. Восень малюе пейзажы ў самыя яркія колеры. Паветра становіцца свежым, а дні – карацейшымі. Неба пацямнела, апусцілася. Дзьме пранізлівы вецер. Хмары плывуць. Ідзе дождж. Птушкі адлятаюць у вырай.)

- Малайцы! Справіліся яшчэ з адным заданнем.

**Прыём “Канструктар”.** На партах ляжаць канверты у якіх знаходзяцца схемы  і словы сказаў, якія трэба скласці. (работа ў парах)

1. Ляцяць у вырай журавы над пожняй.
2. Прыйшла восень.
1. Хутка імчалі на небе ўскудлачаныя хмары.
2. Пачынаўся дождж.

Чытанне сказаў.

- На сталах у вас ляжаць рознакаляровыя лісты, з дапамогай якіх мы будзем правяраць наш тэст: а) чырвоны, б) жоўты, в) аранжавы.

**Выкананне тэста на картках.**

1.Сказы, у склад якіх уваходзіць толькі дзейнік і выказнік, называюцца :

а) развітымі;

б) неразвітымі;

2. Сказы, у якіх, акрамя дзейніка і выказніка ёсць дададзеныя члены, называюцца:

а) развітымі;

б) неразвітымі;

3. Адзначце неразвітыя сказы:

а) Дождж пайшоў;

б) Наступіла залатая восень;

в) Вецер шуміць.

4. Адзначце развітыя сказы:

а) Насоўваецца хмара;

б) Лінуў моцны дождж;

в) Падуў моцны вецер.

Праверка тэста.

III.Завяршальны этап

- Мы справіліся з усімі заданнямі, дзякуючы вашым ведам і ўменням і ўзаемадапамозе. Давайце падагулім, што мы ведаем пра развітыя і неразвітыя сказы.

- Якія сказы вам прыйдуць на дапамогу, каб выказаць дакладна думку?

- Чым адрозніваюцца неразвітыя сказы ад развітых?

Рэфлексія

- Ахарактарызуйце сваю работу на ўроку пры дапамозе прыказкі. Падыміце лісты тыя, хто лічыць, што прыказка характарызуе яго працу.

На яду мастак, а да працы так-сяк.

Слоў мяшок, а спраў на вяршок.

Рабі добра, добра і будзе.

- Давайце звернемся да нашых задач урока. Ці справіліся мы з пунктам “навучымся”? Адказы дзяцей.

Дамашняе заданне, яго тлумачэнне.

Параграф 24, практыкаванне 175 або практыкаванне 176.

Выстаўленне і каменціраванне адзнак.

Урок па беларускай літаратуры ў 5 класе

## Падагульненне вывучанага па раздзеле “Вусная народная творчасць”

Сікорская Юлія Уладзіміраўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
ДУА “Сярэдняя школа №12
г.Светлагорска імя І.Р.Катлярова”

**Тэма: Падагульненне вывучанага па раздзеле “Вусная народная творчасць”**

**Тып урока**: урок абагульнення і сістэматызацыі ведаў і ўдасканальвання навыкаў і уменняў.

**Мэты і задачы:** падагульніць, сістэматызаваць і замацаваць веды пяцікласнікаў па раздзеле “Вусная народная творчасць”; развіваць уменні аналізу, сінтэзу, параўнання; фарміраваць функцыянальную граматнасць праз

практычнае прымяненне ведаў у блізкіх да жыццёвых сітуацыях; выхоўваць павагу і цікавасць да беларускай народнай культуры.

**Абсталяванне:** рабочыя лісты, маркеры, раздатачны матэрыял (карткі з прыкладамі твораў ВНТ, "сшыткі" для працы ў групах), прэзентацыя з выявамі прадметаў беларускага побыту;

**Мэты для вучняў:**

- я ўспомню ўсе віды вуснай народнай творчасці,
- я навучуся адрозніваць фалькслорныя жанры ад іншых твораў,
- я навучуся будаваць свае фальклоныя творы,
- я паспяхова выканаю ўсе заданні.

**Ідэя ўрока**: Фальклор – гэта не пыльны скарб у куфры, а магутная сіла, якая можа дапамагаць нам кожны дзень.

**Эпіграф:**

Ад прадзедаў спакон вякоў
Нам засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

Янка Купала

**Ход урока**

1) **<u>Матывацыйна-арганізацыйны этап</u>**

**Арганізацыйна-псіхалагічная падрыхтоўка вучняў да працы (2 хв.)**

Гучыць музыка, чуецца песня на словы Я.Купалы “Спадчына”, сціхае.

Настаўнік: Вітаю вас, мае даследчыкі народнай мудрасці! Паглядзіце, калі ласка, адзін на аднаго і ўсміхніцеся, бо ўсмешка падаўжае жыццё, дорыць дабрыню, ласку, пяшчоту, чаго так не хапае ў наш імклівы і неспакойны час.

Сёння мы адравімся ў чароўнае падарожжа, зазірнем у мінулае, вернемся ў сучасны дзень.

**Пастаноўка мэты і задач (5 хв.)**

На дошцы і на экране мульціборда вучні бачаць выяву адкрытага куфра.

Вучні атрымліваюць карткі з паняццямі: “традыцыі”, “мова”, “казкі”, “прыказкі”, “загадкі”, “легенда”, “мудрасць”, “гісторыя”, “самабытнасць”, “фальклор”

Н: Раней у кожным доме нашых продкаў стаяў куфар, у якім змяшчаліся самыя неабходныя рэчы, такі ж куфар ёсць сёння і ў нас. Давайце разам з вамі паспрабуем напоўніць яго патрэбнымі нам паняццямі і тэрмінамі.

Як вы думаеце, з якой мэтай мы размясцілі ўсе гэтыя словы на дошцы? Як яны звязаны з тэмай сённяшняга ўрока? (Вучні адказваюць, што ўсе гэтыя паняцці ўваходзяць у нашу сённяшнюю тэму). Настаўнік: усё правільна, давайце паспрабуем вызначыць, што мы павінны будзем ведаць і ўмець у канцы нашага ўрока, вучні агучваюць мэты, настаўнік фіксуе на дошцы **мэты ўрока для вучняў**: ***успомнім*** (настаўнік далучае слова “сістэматызуем”) ***жанры вуснай народнай творчаці, навучымся адрозніваць жанры вуснай народнай творчасці ад літаратурных твораў, навучымся складаць свае невялікія фальклорныя творы).***

Н: Так, сёння мы не проста паўтараем віды фальклору, але будзем вучыцца выкарыстоўваць яго мудрасць у сучасным жыцці, наша мэта - знайсці тыя зярняткі мудрасці, якія схаваны ў тэкстах нашых продкаў і даказаць, што фальклор – гэта не пыльны скарб у куфры, а магутная сіла, якая можа дапамагаць нам кожны дзень! Давайце праверым.

**<u>2) Пазнавальна-аперацыйны этап</u>**

**Абагульненне і сістэматызацыя ведаў (2 хв.)**

Урок у нас сёння незвычайны, бо мы адпраўляемся ў падарожжа, для якога не патрэбны аўтобус, цягнік, самалёт ці карабель. Тут патрэбны толькі вашы веды, уяўленні, жаданні і ўменне быць назіральнымі. Падарожнічаць мы сёння будзем праз час. А каб падарожжа было ўдалым і адчувалі мы сябе ўпэўнена, нам будуць дапамагаць прадметы з нашага куфра. Першы прадмет *лучынка.* (Выява лучынкі на мульцібордзе. Вучні з дапамогай настаўніка ўспамінаюць для чаго выкарыстоўвалі нашы продкі лучынкі, у якой казцы сустракаўся). Агонь – сімвал ведаў. Патрэбна і нам праверыць падарожнікаў на наяўнасць ведаў.

**Інтэрактыўная віктарына Quizizz (5 хв.)**

1. Вусны аповед, заснаваны на містыцы (гэта правер’е)
2.Знайшлі аднойчы парабкі на ўзлеску логавішча (пачатак легенды “Пестунь”)
3. Што з гэтага НЕ з'яўляецца фальклорам? (Казка, песня, **раман**, прыказка )
4. Што аб'ядноўвае казку, песню, загадку, прыказку і прымаўку?
5. Адзін добры вопыт мудрэй за сем разумных павучанняў. Які жанр? (прыказка)
6.Што такое вусная народная творчасць?
6. Пералічыце жанры ВНТ (казкі, легенды, паданні, загадкі, павер’і)
7. Чаму ВНТ завецца "вусная" і "народная"? Запішы трыма словамі
8. Які элемент казак НЕ з'яўляецца адметнай рысай казкі?
А) Зачыны («У некаторым царстве...»)
Б) Канцоўкі («І я там быў...»)
**В) Эпіграф (кароткая цытата перад творам)**
Г) Лічба тры

**Удасканаленне навыкаў і ўменняў на аснове прымянення абагуленых ведаў у новых сітуацыях (20 хв.)**

Н: Наша падарожжа ў часе працягваецца. Веды ў вас трывалыя, вы поўнасцю гатовыя да падарожжа, а прадметы, якія я дастаю з куфра, гэта яблык і талерка, як у казках можна было выкарыстаць гэтыя цудадзейныя прадеты? І чым іх можна замяніць у сённяшні час? (Вучні адказваюць, што можна замяніць камп’ютарам або смартфонам, а гэта значыць наш прыпынак будзе на мяжы мінулага і сучаснага). Мы адпраўляемся на станцыю “Практычная”.

Клас дзеліцца на 3 групы. Кожная група атрымлівае “Куфэрак” з матэрыяламі па адной з тэм і творчае заданне, звязанае з функцыянальнай граматнасцю. (Вучні працуюць у трох групах, выконваюць заданні. Абмяркоўваюць, аналізуюць тэкст, шукаюць рашэнні, ствараюць міні-плакаты,

запаўняюць кластары. Карыстаюцца стыкерамі і гатовымі словамі-апорамі, якія можна ўклейваць у мадэль праекта)

**1 група “Казачнікі”**

Працуюць з казкай “Музыкі”, “Залаты птах”

Заданне: “Вы – псіхолагі. Распрацуйце “Памятку сучаснага школьніка”. Запішыце пяць пунктаў-рэкамендацый для аднакласнікаў на аснове гісторыі музыкаў і Івана. Якія прыёмы пераадолення страху выкарысталі героі? Як не трапіць у небяспечную сітуацыю? Ці сустракаем мы страх у сучасным жыцці (напрыклад, страх адказу на ўроку, выступлення)?

**2 група “Легендарныя турагенты”**

Матэрыял “Легенды” ("Нарач"). Заданне: "Стварыце “Эка-паштоўку” з выявай возера і кароткім тэкстам-прыкметай для турыстаў ('Калі бачыш гэта возера - памятай...')"

**3 група “Загадкавы квэст-пакой”**

Матэрыял "Загадкі". Заданне: "Распрацуйце “Квэст для малодшага брацiка ці сястрычцы” з 3-4 загадкамі пра прадметы вакол нас"

**Прэзентацыя груп** (7хв.)

Прадстаўнікі груп каротка прадстаўляюць вынікі сваёй працы: вывешваюць гатовы прадукт дзейнасці, зачытваюць рэкамендацыі, прадстаўляюцьэка-паштоўку, дэманструюць квэст.

**<u>3) Дыягнастычна-карэкцыйны этап</u> (7 хв.)**

Н: наступны прадмет, які мы дастаем з нашага куфра, гэта люстэрка. Яно дапаможа нам вярнуцца ў мінулае і знайсці адказ на важнае пытанне.

Паглядзіце ў люстэрка народнай мудрасці. Ці змаглі вы знайсці адказы на пытанні, пастаўленыя ў пачатку урока?

**- Гутарка, заснаваная на метадзе “Тоўстыя” і “тонкія” пытанні”**

- Ці могуць легенды дапамагчы берагчы прыроду?
-Якія казачныя парады актуальныя сёння?
-Як прыказкі дапамагаюць прымаць рашэнні?
- Якія сучасныя правілы жыцця можна вывесці з казкі?

**<u>4) Завяршальны этап</u>**

**Падвядзенне вынікаў урока і рэфлексія (3 хв.)**

Настаўнік: Мы з вамі здзейснілі незвычайнае падарожжа, выканалі ўсе заданні, пагаварылі пра нашу спадчыну. Аўтарам яе з’яўляецца беларускі народ. Спадчына нам засталася, каб мы яе ведалі і берaглі. (Настаўнік вяртае вучняў да метафары “скарбонкі”і “куфра”).

Н: Што каштоўнага вы сёння паклалі ў свой куфар ведаў? Якое “залатое зерне” мудрасці з фальклорных твораў вы возьмеце з сабой у жыццё?”. (Вучні пішуць на залатых зярнятах словы – асацыяцыі з урокам і тэмай, фіксуюць іх на дошцы).

Настаўнік аб’яўляе і абгрунтоўвае адзнакі за працу на ўроку.

**Дамашняе заданне (на выбар) (1 хв.)**

1) Стар.71, пытанне 6 (выканаць тэставае заданне па раздзеле)
**2)** Стар.71, пытанне 8 (скласці загадкі па малюнках)
3) Стварыць комікс “Сучасныя прыгоды Залатога птаха”

**МАЙСТАР-КЛАС**
**“Ад візуалізацыі да рэальнага дзеяння:**
**як прыёмы візуалізацыі дапамагаюць развіваць функцыянальную пісьменнасць на ўроках беларускай мовы”**

Лучыновіч Марына Віктараўна,
Рабок Ірына Іванаўна,
настаўнікі беларускай мовы і літаратуры
ДУА “Сярэдняя школа № 12 г.Светлагорска імя. І.Р. Катлярова”

***Для жыцця, а не для школы мы вучымся.***
***Ян Амос Каменскі***




**Мэта:** паказаць патэнцыял прыёмаў візуалізацыі як эфектыўнага сродку фарміравання функцыянальнай пісьменнасці, які дазваляе вучням свабодна і самастойна выкарыстоўваць веды ў жыццёвых сітуацыях.

**Задачы:**
раскрыцьзмест майстар-класа праз знаёмства з прыёмамі работы;
прадэманстраваць практычныя прыклады выкарыстання прыёмаў візуалізацыі для фарміравання функцыянальнай пісьменнасці на розных этапах урока і для розных тэм;
арганізаваць практычную работу ўдзельнікаў.

**Ход майстар-класа:**

*Удзельнікі майстар-класа падзяляюцца на тры групы ў залежнасці ад колеру стужкі, якую яны атрымалі пры ўваходзе ў аўдыторыю.*

**І. Арганізацыйна-матывацыйны этап**
**1.** Прывітанне ўдзельнікаў майстар-класа.
**2.** Пытанне-размінка: «З якой цяжкасцю Вы як настаўнік сутыкаецеся часцей за ўсё?» (Напрыклад: «Вучні завучваюць правілы, але не ўжываюць іх на практыцы», «Не бачаць сувязей паміж тэмамі», «Не могуць прааналізаваць тэкст»). Гэта падводзіць да праблемы, якую мы будзем вырашаць.
Зварот да воблака слоў.




**3.** Пазнавальны этап.

Функцыянальная пісьменнасць – адзін з ключавых паказчыкаў якасці адукацыі і важны кампанент эфектыўнай камунікацыі. У сучасным свеце чалавек сутыкаецца з вялікім патокам інфармацыі, якая патрабуе крытычнага аналізу і разумення моўных структур. Таму развіццё здольнасці вучняў прымяняць моўныя веды на практыцы становіцца неабходнай умовай паспяховага навучання і сацыялізацыі.

Вучэбны прадмет «Беларуская мова» адыгрывае значную ролю ў гэтым працэсе, паколькі спрыяе фарміраванню моўнай кампетэнцыі, уменню аналізаваць і ствараць тэксты, а таксама разумець і адэкватна выкарыстоўваць мову ў розных камунікатыўных сітуацыях. Развіццё функцыянальнай пісьменнасці патрабуе комплекснага падыходу, які спалучае тэарэтычнае вывучэнне моўных норм з практычнымі заданнямі, накіраванымі на іх прымяненне.

Вучэбны прадмет «Беларуская мова» мае вялікі патэнцыял для фарміравання функцыянальнай пісьменнасці вучняў. Праз разнастайныя віды маўленчай дзейнасці (чытанне, пісьмо, размову, слуханне) вучні развіваюць уменне арыентавацца ў тэкстах, разумець іх сэнс і структуру, выкарыстоўваць моўныя сродкі ў адпаведнасці з камунікатыўнай сітуацыяй.

Адным з эфектыўных сродкаў фарміравання функцыянальнай пісьменнасці вучняў з’яўляецца візуалізацыя вучэбнага матэрыялу, гэта значыць працэс стварэння візуальных вобразаў. Візуалізацыя паляпшае запамінанне, структурыруе мысленне, раскрывае сувязі, падтрымлівае ў розных відах дзейнасці.

Візуалізацыя вучэбнай інфармацыі – гэта працэс прадстаўлення дадзеных у выглядзе выявы з мэтай максімальнага зручнасці яе разумення: наданне зрокавай формы любому мажліваму аб’екту, працэсу і г.д.

Шырокае выкарыстанне сучасных прыёмаў візуалізацыі дае магчымасць мадэліраваць вучэбны матэрыял так, каб забяспечыць макісмальную актывізацыю пазнавальнай дзейнасці вучняў.

## Мадэль фарміравання і развіцця функцыянальнай пісьменнасці






**Дрэва** – функцыянальна пісьменная асоба.

**Лейка** – настаўнік.

**Вада** – педагагічныя тэхналогіі.

**Яблыкі** – ключавыя кампетэнцыі.

Наша мэта – навучыць вучня не «ведаць пра дзеяслоў», а «ўмець правільна ўжываць дзеясловы ў мове».

**ІІ. Практычны этап**

**1.** Прыём “Вешалка”.

На ўроках выкарыстоўваем такі прыём як “Вешалка”, які дазваляе атрымаць візуальную карцінку пра тое, наколькі добра вучні засвоілі раней вывучаны матэрыял. Пры вывучэнні розных часцін мовы раздаём вучням загатоўкі вешалак, на якіх ім трэба “павесіць” усю тую інфармацыю, якую яны памятаюць з папярэдніх класаў. У працэсе вывучэння тэмы вучні дапаўняюць вешалку новай інфармацыяй. Гэтым прыёмам можна карыстацца на любым этапе вывучэння пэўнай часціны мовы (на ўводных занятках, на занятках па вывучэнні новай тэмы, пры паўтарэнні і замацаванні ведаў). Для адбору інфармацыі для “Вешалкі” па пэўнай тэме можна выкарыстоўваць лінгвістычныя казкі.

Плюсы выкарыстання “Вешалкі”: ахоп вялікага аб’ёму інфармацыі, уцягванне ўсіх вучняў у працэс работы і, як вынік, актыўнасць навуцэнцаў.

**2.** Прыём “Пантбук”.

На ўроках карыстаемся яшчэ такім прыёмам, як “Пантбук”. Выкарыстоўваць яго можна на любым этапе урока, а таксама можна працаваць індывідуальна, у парах, або групах. Мэта гэтага прыёма ў тым, каб зацікавіць вучняў, скласці пашпарт пэўнай часціны мовы, і карыстацца ім ў далейшым. Па знешніх баках вучні павінны запісаць адказы на тэарэтычны матэрыял, а ўнутры павінны выканаць практычнае заданне па тэме.




**3.** Прыём “Скарбонка лічэбнікаў”

Вывучэнне тэмы “Разрады і правапіс лічэбнікаў” выклікае цяжкасці ў сучасных школьнікаў. Для лепшага засваення ведаў па тэме выкарыстоўваем прыём “Скарбонка лічэбнікаў”. Мэта дадзенага прыёму: праз візуальны вобраз, прывычны для вучняў, запомніць разрады і правапіс лічэбнікаў.

Работа з тэкстам

У шостым класе вучацца дваццаць чатыры вучні. На ўроку настаўніца прапанавала ім цікавы праект: арганізаваць школьны кірмаш.

Кожны вучань унёс адну другую частку сваіх кішэнных грошай у агульны бюджэт. У выніку атрымалася дванаццать рублёў. Гэта была першая сума, якую яны маглі выкарыстаць для пакупкі прадуктаў і матэрыялаў.

На наступным этапе вучні падзяліліся на четыры групы: адна адказвала за дызайн, другая – за рэкламу, трэццяя – за пакупкі, а чацьвёртая – за падлік прыбытку. Кожная група атрымла па тры рублі.

На кірмашы яны прадалі трыцаць шесць вырабаў ручной працы. Кожны каштаваў па адной чацьвёртай рубля. Усяго яны зарабілі девяць рублёў.

Пасля падліку прыбытку вучні вырашылі падзяліць грошы на тры роўныя часткі: адна – на дабрачыннасць, другая – на класныя патрэбы, а трэццяя – на невялікія падарункі для ўдзельнікаў.

Заданні да тэксту:

1. Знайдзіце ў тэксце лічэбнікі.
2. Размяркуйце іх на групы (цэлыя, дробавыя, парадкавыя, зборныя)
3. Выправіце памылкі ў напісанні лічэбнікаў.
4. Разрадаў якіх лічэбнікаў няма ў тэксце, дапоўніце ўласнымі прыкладамі.

*(Дэманстрацыя дыдактычнай гульні на размеркаванне лічэбнікаў па групах )*



**4.** Выкарыстанне флэш-картак пры вывучэнні арфаграфіі.

Флэш-карты – гэта просты, але вельмі эфектыўны спосаб зрабіць урокі больш цікавымі, прадуктыўнымі і разнастайнымі.

Флэш-карты – гэты невялікія карткі, на адным баку якіх знаходзіцца пытанне, заданне або выява (словы з прапушчанымі літарамі), а на другім – адказ або тлумачэнне. Яны могуць быць выкарыстаны для вывучэння і замацавання па розных тэмах.

Выкарыстанне гэтага прыёму дазваляе арганізаваць работу вучняў па вывучэнні пэўнай тэмы і дапамагае якасна падрыхтавацца да кантрольных работ, выпускнога экзамену і ЦЭ.



**5. Праца ў групах.**

Заданні для ўдзельнікаў:

Група 1: На аснове лінгвістычнай казкі скласці візуальны вобраз па адной з часцін мовы, прымяняючы прыём “Вешалка”.

Група 2: Скласці лінгвістычную казку, карыстаючыся звесткамі з “лінгвістычнага слоіка”.

Група 3: На аснове прапанаваных прыкладаў скласці “Пантбук” на тэму “Складаназалежны сказ” *(удзельнікі працуюць на вялікіх лістах паперы)*

Прэзентацыі і абмеркаванне работ.

## ІІІ. Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія.



**БЫЛО ЦІКАВА**



**МНЕ СПАДАБАЛАСЯ БОЛЬШ ЗА ЎСЁ…**



**МОЙ ВОДГУК ТАКІ …**



**ПАДЗЯЛЮСЯ З КАЛЕГАМІ ПРА…**

**Абагульненне:** Візуалізацыя – не проста “прыгожа”, але і “функцыянальна”. Яна служыць не проста развіццю ўменняў, а і засваенню ведаў.

**Парады для настаўніка:**

Пачынайце з простага.

Рабіце сумесна, потым давайце самастойнае заданне.

Выкарыстоўвайце розныя прыёмы пад розныя задачы.

Заахвочвайце асабістую творчасць вучняў у стварэнні схем.

***Майстар-клас***
***“Медыяграматнасць як неад’емны фактар развіцця метадалагічнай культуры вучняў”***

Лупсякова Анастасія Сяргееўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
ДУА “Сярэдняя школа №13 г.Жлобіна
імя В.В. Гузава”

**Тэма: Медыяграматнасць як неад’емны фактар развіцця метадалагічнай культуры вучняў**

**Мэта:** мяркуецца, што па заканчэнні майстар-класа ўдзельнікі будуць ведаць, што такое медыяграматнасць; мець уяўленне аб прыёмах медыяграматнасці для павышэння эфектыўнасці ўрокаў беларускай літаратуры, выканаюць творчае заданне.

**Задачы:**

стварэнне ўмоў для фарміравання матывацыі ўдзельнікаў майстар-класа да азнаямлення з паняццем “медыяграматнасць” і “медыяадукацыя”;

садзейнічаць фарміраванню ў удзельнікаў майстар-класа першаснага вопыту творчай дзейнасці з выкарыстаннем прыёмаў медыяграматнасці;

стварэнне прадуктаў сумеснай творчай дзейнасці на аснове камунікатыўнага ўзаемадзеяння ўдзельнікаў мастар-класа.

Аўдыторыя: настаўнікі беларускай мовы і літаратуры.

Выбар гэтай тэмы абгрунтаваны яе практычнай значнасцю. Матэрыялы, якія прадстаўлены ў рабоце, дапамогуць настаўнікам мовы і літаратуры ўнесці новае ў свой звычайны ўрок, зацікавяць вучняў, а таксама дазволяць у поўнай меры карыстацца прыёмамі медыяграматнасці ў сваёй практыцы.

**Ход работы**

**1. Арыентацыйна-матывацыйны этап**

*Педагогі ўваходзяць і дастаюць з мяшэчка паперу. Згодна з тым, што на паперы намалявана ці напісана, фарміруюцца тры працоўныя групы настаўнікаў (дадатак 1).*

Добры дзень, паважаныя калегі! Я рада вас вітаць і спадзяюся на сумесную паспяховую і плённую калектыўную работу. Спадзяюся, што сённяшні майстар-клас будзе для вас цікавым, карысным, а самае галоўнае - прынясе вам шмат станоўчых эмоцый і вы застанецеся задаволены праведзенай работай. На працягу майстар-класа будзе працаваць адкрыты мікрафон. Кожны з вас можа выказаць свае думкі па прапанаванай тэме і задаць пытанні.

- Як вы лічыце, па якім прынцыпе сфарміраваны вашы групы?

- Напішыце, калі ласка, на паперы вашае імя і прозвішча для таго, каб кожны з вас змог паўдзельнічаць у працэсе майстар-класа.

Для таго, каб наша работа была больш прадуктыўнай, прапаноўваю вызначыць правілы работы ў працэсе майстар-класа. Абгаварыце гэтыя правілы ў групе. Агучце іх з дапамогай малюнкаў.

*(30 секунд на абмеркаванне ў групе і агучванне вынікаў)*



Правіла 1.

**Актыўна працаваць у групе**



Правіла 2.

**Правіла ўзнятай рукі**



Правіла 3.

**Выконваць рэгламент часу**

**2. Актуалізацыя суб'ектнага вопыта ўдзельнікаў**

Галоўнай мэтай сучаснай адукацыі з’яўляецца падрыхтоўка вучня да рэальнага жыцця. Настаўнікі павінны даць яму магчымасць без праблем стаць актыўным грамадзянінам нашай краіны.

Згодна з вучэбнай праграмай па беларускай літаратуры вучні павінны ўмець:

**складаць план і канспект** літаратурна-крытычнага артыкула;

Валодаць:

**навыкамі абагульнення, сістэматызацыі і супастаўлення вывучанага**, выяўлення адметных рыс характару герояў;

**навыкамі параўнання** літаратурных твораў з творамі іншых відаў мастацтва;

**рознымі відамі літаратурна-творчай дзейнасці** [1].

Згодна з патрабаваннямі вучэбнай праграмы і колькасцю інфармацыі, якую трэба засвоіць вучням, можна зрабіць вывад, што вучняў, якія сёння прыходзяць у школу, трэба вучыць іншымі метадамі і прыёмамі. Ці згодны вы з гэтым? *(Настаўнікі выказваюць свае думкі наконт прапанаванага пытання).*

**3. Мэтавызначэнне**

Калі ёсць пытанне, задача, то і павінен быць адказ. Для таго, каб майстар-клас прайшоў паспяхова, мы павінны паставіць перад сабой мэты. Перад Вамі "Картка-прагноз". Запішыце, калі ласка, на гэтых картках што б вы хацелі засвоіць і чаму навучыцца ў працэсе мастар-класа.

*(Майстар прапаноўвае "Картку-прагноз". Настаўнікі запаўняюць карткі і агучваюць вынікі).*

| **Пытанні** | |
|---|---|
| Ці ведаеце вы, што такое медыяадукацыя і медыяграматнасць? | |
| Ці сустракаліся з імі ў сваёй прафесійнай дзейнасці? | |
| Што вы чакаеце ад майстар-класа? | |
| На якія пытанні хацелі б знайсці адказы? | |

*(Зварот да тэмы, мэты і задач майстар-класа).*

**4. Інфармацыйна-дзейнасны этап**

*(Майстар знаёміць педагогаў з тэрмінамі "медыяадукацыя" і "медыяграматнасць")*

На сённяшні дзень на выхаванне, развіццё і адукацыю вучня ўплывае не толькі школа, але і медыяпрастора. Вучні маюць неабмежаваны доступ да любой інфармацыі, але мала хто клапоціцца аб тым, каб праверыць праўдзівасць крыніцы, прааналізаваць яе.

Развіццё медыяграматнасці – гэта патрабаванне сучаснага жыцця. Ад таго, наколькі вучань будзе медыяпісьменны, наколькі будзе развіта яго крытычнае мысленне, залежыць наша будучыня. Інфарматызацыя і глабалізацыя зрабілі наша ўспрыняцце свету ў многім адпаведным таму, як падаюць яго медыя. Таму хочацца, каб нашы вучні навучыліся самастойна ацэньваць падзеі, прымаць рашэнні, рабіць выбар не пад уплывам эмоцый або маніпуляцый, а ацаніўшы інфармацыю, якасць аргументаў і г. д.

Пазнаёмімся з асноўнымі тэрмінамі па тэме. Суаднясіце левы слупок і правы.

| | |
|---|---|
| **Медыяпісьменнасць** | любое паведамленне, перададзенае з дапамогай візуальных ці аўдыя сродкаў [2]. |
| ***Медыяадукацыя*** | найважнейшая сучасная кампетэнцыя, якую патрэбна фарміраваць у навучэнцаў як мага раней. У школе няма асобнага прадмета, дзе б гэта можна было ажыццявіць, таму кожны настаўнік павінен падумаць аб тым, як інтэграваць медыяадукацыю ў свой вучэбны прадмет [2]. |

| | |
|---|---|
| ***Медыяграматнасць*** | гэта шлях дапамогі вучням, якія жывуць у інфармацыйным грамадстве і залежаць ад тэхналогій; выхаванне ў іх здольнасці глядзець на свет самастойна і прымаць свае ўласныя рашэнні; працэс развіцця асобы з дапамогай і на матэрыяле медыя [2]. |
| ***Медыятэкст*** | сукупнасць навыкаў і ўменняў, якія дазваляюць знаходзіць патрэбную інфармацыю; аналізаваць, ацэньваць паведамленні ў розных відах медыя; ствараць уласныя тэксты ў розных відах, жанрах і формах медыя [2]. |

**Гульня «Медыяежа»**

Што вы ведаеце пра апельсіны? Якія могуць быць станоўчыя і адмоўныя бакі іх ужывання? *(На дошцы робіцца запіс у дзве калонкі.)*

| ***Станоўчыя бакі*** | ***Адмоўныя бакі*** |
|---|---|
| Гэта ежа | Алергія |
| Шмат вітамінаў | Калі іх пераесці, то можа забалець жывот |
| Карысныя | Калі апельсіны няякасныя, няспелыя, то можа стаць блага, можна атруціцца |
| Атрымліваеш задавальненне, калі іх ужываеш | |
| Апельчіны любяць і ўжываюць і дарослыя, і дзеці | |

З таго, што мы вызначылі, зразумела: апельсіны патрэбны арганізму. Улічваючы інфармацыю другой калонкі, нам патрэбны адказы на пытанні: колькі апельсінаў можна з’есці, каб не атрымаць алергію, каб не забалеў жывот; якія павінны быць апельсіны і г. д. Дзе знайсці патрэбную інфармацыю? Пералічыце тыя крыніцы інфармацыі, якімі вы карыстаецеся *(даведнік, энцыклапедыя, інтэрнэт і г. д.).*

Назавіце крыніцу, якую вы найчасцей выкарыстоўваеце.

Усё названае – гэта **медыяпрадукты** – інфармацыя, якую мы спажываем з розных крыніц. Як апельсіны і іншыя прадукты харчавання забяспечваюць наш арганізм патрэбнымі рэчывамі для нармальнага існавання, так «медыяпрадукты» забяспечваюць наш мозг інфармацыяй для нармальнага развіцця.

Давайце звернемся да запісаў у табліцы і параўнаем якасць апельсінаў і якасць інфармацыі.

1. Калі апельсін можа быць небяспечным?

2. А ці ведаеце вы выпадкі, калі чалавеку было дрэнна ад ужывання няякаснай “медыяежы*”?*

3. Калі мы прыходзім у краму альбо на кірмаш, як мы выбіраем апельсіны?

4. А на што мы павінны звярнуць увагу, калі выбіраем інфармацыю?

У выніку такой гутаркі прыходзім да высновы, што «медыяежа» можа быць карыснай і шкоднай, і адносіцца да яе патрэбна адказна.

Але не ўсё так проста. Скажыце, што гэта? *(Дэманструецца фрукт, падобны на апельсін. Таму чакаемы адказ – «апельсін».)*

А вось і не. Гэта клеменцін. Гібрыд мандарына і апельсіна, вельмі падобны да апельсіна. А ёсць яшчэ «гамлін», «верна», «салусціяна», «кара-кара» і інш.

Значыць, не ўсё, што мы бачым, адпавядае таму, што мы аб гэтым думаем. Таму патрэбна вельмі ўважліва ставіцца да любой інфармацыі, якую мы спажываем з любых медыякрыніц. Неабходна разумець, што ёсць факт, а ёсць меркаванне.

**Факт** – дакладная інфармацыя, якую можна пацвердзіць або абвергнуць.

**Меркаванне** – гэта перакананне або нечая суб’ектыўны пункт гледжання. На меркаванні ўплываюць нашы сімпатыі/антыпатыі, эмоцыі, жыццёвы вопыт і інш. [2, с. 64–65].

Такім чынам, медыяадукацыя – гэта не модны трэнд. Медыяадукацыя – гэта працэс выхавання медыякультуры, фарміруе крытычнае і аналітычнае мысленне, з дапамогай якога чалавек абараняе сябе ад шкоднай інфармацыі і выкарыстоўвае тую, што патрэбна для жыцця і прафесійнай дзейнасці.

Улічваючы захопленасць вучняў сацыяльнай сеткай Інстаграм, прапаную прыём “Інстаграм старонка”. Для найбольш поўнай характарыстыкі галоўнага героя неабходна запоўніць яго асабістую старонку, карыстаючыся ўрыўкамі з твора, фотаздымкамі. Мэтай прыёму з’яўляецца развіццё аналітычных уменняў рабіць высновы з тэкставага паведамлення, выяўляць матывы ўчынкаў герояў, аўтарскую пазіцыю. Часцей за ўсё выкарыстоўваю гэты прыём у 9 класах пры вывучэнні біяграфій пісьменнікаў *(дадатак 2).*

**4.1. Выкананне практычнай часткі майстар-класа**

Сёння я прапаную вам, паважаныя калегі, папрацаваць з прыёмам “Інстаграм старонка”, які я выкарыстоўваю пераважна ў старэйшых класах пры вывучэнні жыцця і творчасці пісьменнікаў.

Група 1. Францыск Скарына

Група 2. Ефрасіння Полацкая

Група 3. Якуб Колас

Задача кожнай групы:

Стварыць інстаграм старонку вядомага беларуса, напісаць звесткі пра яго, а таксама пост *(дадатак 3).*

5. **Рэфлексія**

Выкарыстанне прадуктаў медыяадукацыі дапамагае хутка запамінаць матэрыял, цікава і рацыянальна працаваць, хутка ўспамінаць вучэбны матэрыял.

Звернемся да сваіх картак-прагнозаў. Успомніце, чаго вы чакалі ад майстар-класа. Ці спраўдзіліся вашы чаканні? Ці знайшлі вы адказы на тыя

пытанні, якія паставілі для сябе ў пачатку? Што здалося вам незвычайным? Што зможаце выкарыстоўваць ў сваёй рабоце?

## Спіс выкарыстаных крыніц

1.Медыяадукацыя ў школе: фарміраванне медыяграматнасці вучняў : дапаможнік для настаўнікаў / М. І. Запрудскі, А. А. Палейка, А. У. Радзевіч, Т. П. Мацкевіч [і інш.] ; пад рэд. М. І. Запрудскага. – Мінск, 2016. – 334 с.

Дадатак 1

*Вокладкі груп (размешчаны на сталах)*

| | | |
|---|---|---|
|  *1.* |  *2.* |  *3.* |

# ІНСТАГРАМ Старонка



Пост: 3 Падпісчыкі: 379 тыс. Падпіскі: 12

@_Францыск_Скарына

Статус жыцця:

першадрукар, філосаф-гуманіст, пісьменнік, грамадскі дзеяч, прадпрымальнік і вучоны-медык.

Прыватная інфармацыя:

Краіна: Беларусь

Горад: Полацк

Нарадзіўся: ≈1490 ≈1551.

Асноўны занятак:

Пераклад кніг Бібліі, выдавец гэтых кніг.

Геалакацыя / важныя падзеі жыцця:

У 1506 г. скончыў Кракаўскі ўніверсітэт.

1517 г. выдаў Біблію на старабеларускай мове.

1517-1519 г. выдаў 23 кнігі Бібліі.

1522 г. выдаў Малую падарожную кніжку.

≈1551 Памёр ў Празе.

Пост: дзеці: Сімеон Гус Скарына, жонка: Маргарыта Адвернік. Быў патрэбен там, меў павагу да сваёй айчыны.

"Бывае поспех чалавеку дазма, Спадчына: а знаходка - у страту".









945 767тыс. 195

ПУБЛІКАЦЫІ ПАДПІСНЫКІ ПАДПІСКІ

Падпісацца ▽

Статус жыцця: вучоны, асветнік, гуманіст, батанік, астраном, паэт і медык.

Прыватная інфармацыя:

Краіна: Беларусь

Горад: Полацк

Нарадзіўся: 6 сакавіка 1486 г.

Спадчына:

Перакладзеную са старой царкоўнаславянскай мовы Біблію.

Асноўныя заняткі:

ажыццяўленне перакладу Бібліі, аўтар каментарыяў (прадмоў і пасляслоўяў) к Бібліі, заснавальнік папулярных жанраў беларускай літаратуры XVI – XVII в.

Геалакацыя / важныя падзеі жыцця

- 1504 г. – поступил в Краковскую академию (універ
- 06.08.1517 г. – была издана 1-ая книга – Псалтырь.
- 09.11.1512 г. – перед высокопоставленной вченой аудиторией ён успешно выдержал 2 экзамена и стал доктором медицинских наук
- 1529 г. – камера сгорела
- 1525 г. – был выпущен последние творение „Апостол"
- 06.03.1486 г. – Дзень нараджэння

Пост:

1. "Найдаражэйшыя скарбы – чалавечыя словы, натхнёныя Богам і выслоўленыя для Бога"
2. "Кожны чалавек разумее свае шчасце на-свойму"
3. "Любіце кнігу, бо яна – крыніца мудрасці, ведаў і навукі, лекі для душы"

**Майстар-клас**
**“РАБОТА З ТЭКСТАМ ЯК АСНОЎНЫ СПОСАБ ФАРМІРАВАННЯ ЧЫТАЦКАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ ВУЧНЯЎ”**

Еўстраценка Людміла Віктараўна,
настаўнік беларускай мовы
і літаратуры ДУА «Гімназія г. Чачэрска»

**Мэта** – стварэнне ўмоў для паўнавартаснага праяўлення і развіцця педагагічнага майстэрства яго ўдзельнікаў на аснове арганізацыі прасторы, накіраванай на абмен вопытам работы з тэкстам.

**Задачы:**

стварыць умовы для прафесійнага самаўдасканалення настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры;

падзяліцца вопытам работы шляхам дэманстрацыі найбольш эфектыўных прыёмаў работы з тэкстам, паказаць іх практычную значнасць пры фарміраванні чытацкай пісьменнасці вучняў;

у працэсе педагагічнай камунікацыі прааналізаваць дыдактычны матэрыял па тэме вопыту, які дэманструецца;

адрэфлексаваць уласнае прафесійнае майстэрства ўдзельнікаў майстар-класа.

**Мэтавая аўдыторыя:** настаўнікі беларускай мовы і літаратуры.

**Прагноз вынікаў работы ўдзельнікаў майстар-класа:** мяркуецца, што ўдзельнікі майстар-класа павысяць узровень уласнай інфармацыйнай кампетэнцыі, атрымаюць магчымасць пашырэння ведаў пра выкарыстанне розных прыёмаў работы з тэкстамі на ўроках беларускай мовы і літаратуры і змогуць самастойна выкарыстоўваць іх для развіцця ўнутранай матывацыі вучняў да навучання, для аптымізацыі працэсу навучання ўвогуле.

**Абсталяванне:** камп’ютар, праектар, канверты з заданнямі, карткі-сімвалы для рэфлексіі.

**Эпіграф:**

Мамін ручнік —
белая дарога ў вечнасць.
Н.Загорская.

Ход майстар-класа

I**. Матывацыйна-арганізацыйны этап.**

Добры дзень, шаноўныя калегі!

Запрашаю вас на майстар-клас, і сёння нашай працоўнай матэрыяй стане тэкст «Беларускі ручнік». Ручнік – сімвал, які прашывае сабой ніці мовы, гісторыі, культуры і асабістага светапогляду, сімвал, які яднае пакаленні. Яднанне пакаленняў – гэта адна з галоўных задач выхавання, бо кожны дзень мы, настаўнікі, працуем з самым дарагім і каштоўным – душамі нашых вучняў.

*Майстар прапаноўвае ўдзельнікам майстар-класа размеркавацца на тры групы шляхам выбару сімвала. Сімвалы беларускага арнаменту загадзя падрыхтаваны. Удзельнікі выцягваюць знакі і займаюць месцы ў групах.*

**ІІ. Пастаноўка педагагічнай праблемы.**

Фарміраванне чытацкай пісьменнасці вучняў – гэта адна з актуальных праблем сучаснай адукацыі.

У наш час, калі пануе тэлебачанне, камп'ютары, відэагульні, дзеці губляюць цікавасць да чытання. Навучыць дзяцей правільнаму, бегламу, выразнаму, а галоўнае, усвядомленаму чытанню – адна з галоўных задач адукацыі.

У сваёй практыцы мы сутыкаемся з наступнымі праблемамі:

прыходзячы ў пяты клас, дзеці маюць слабую хуткасць чытання;

большасць вучняў не разумее сэнсу прачытанага;

не могуць атрымаць неабходную інфармацыю з прапанаванага тэксту;

сутыкаюцца з цяжкасцю ў пераказе зместу прачытанага.

Што ж гэта такое чытацкая пісьменнасць?

«Чытацкая пісьменнасць – здольнасць чалавека разумець і выкарыстоўваць пісьмовыя тэксты, разважаць пра іх і займацца чытаннем для таго, каб дасягаць сваіх мэт, пашыраць свае веды і магчымасці, удзельнічаць у сацыяльным жыцці».

Такім чынам, мэта чытача – пераўтварэнне зместу прачытанага «для сябе», гэта значыць разуменне. Такім чынам, ПРАЧЫТАЦЬ = ЗРАЗУМЕЦЬ.

Практычна кожны ўрок мы пачынаем з этапу выкліку. Ён неабходны для таго, каб актуалізаваць і абагульніць веды вучняў па вывучаемай тэме; падтрымліваць цікавасць, матывацыю вучняў да вучэбнай дзейнасці; заахвочваць вучняў да актыўнай працы не толькі на ўроку, але і дома.

Прыём «Ці верыце вы…»

1. Ці верыце вы, што можна дзяцей навучыць вучыцца?

2. Ці верыце вы, што школа можа існаваць без дзяцей?

3. Ці верыце вы, што работа з тэкстам ўплывае на развіццё маўлення дзіцяці?

4. Ці верыце вы, што фарміраванне чытацкай пісьменнасці не адыгрывае ніякай ролі ў навучанні дзяцей?

5. Ці верыце вы, што настаўнік знаходзіцца ў пастаянным пошуку новых ідэй?

6. Ці верыце вы, што пасля заканчэння майстар-класа вы нічога не возьмеце для сваёй педагагічнай скарбонкі?

Я таксама ў гэта не веру. Які прыём я зараз выкарыстоўвала?

Прыём «Ці верыце вы…» можа быць пачаткам урока. Ён дапамагае звязваць разрозненыя факты ў адзіную карціну; сістэматызаваць ужо вядомую інфармацыю.

Гэты прыём можа стаць нетрадыцыйным пачаткам урока і ў той жа час садзейнічаць удумлівай працы з тэкстам, крытычна ўспрымаць інфармацыю, рабіць высновы. Вучням прапаноўваюцца сцверджанні, з якімі яны працуюць двойчы: да чытання тэксту падручніка і пасля знаёмства з ім. Атрыманыя вынікі абмяркоўваюцца.

Неабходна сказаць, што спецыфіка прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» ў тым, што на ўроках настаўніку і вучням даводзіцца працаваць з рознымі тыпамі тэкстаў:

мастацкі тэкст – навукова-папулярны тэкст;

суцэльны тэкст – несуцэльны тэкст.

*Абмеркаванне.*

Алгарытм працы з навукова-папулярным тэкстам:
чытанне і разуменне сэнсу тэксту;
уменне знаходзіць інфармацыю, патрэбную для разумення сэнсу;
інтэрпрэтацыя тэксту;
уменне пераўтварыць тэкст.

Сёння мы папрацуем з суцэльным тэкстам. Жадаю плённай працы.

**III. Практычная дэманстрацыя прыёмаў работы з тэкстам.**

1. *Гледзячы на фрагменты (сімвалы беларускага арнаменту), удзельнікі ў групе ствараюць асацыятыўны рад (прыём «Мазгавы штурм»). Пасля гэтага майстар прапаноўвае ўдзельнікам акрэсліць тэму тэксту, з якім сёння ім давядзецца працаваць.*

2. Знаёмства з тэкстам (дадатак 1). *Кожны ўдзельнік знаёміцца самастойна.*

Беларускі ручнік

У жыцці нашага народа ручнік выконваў шмат функцый.

На першае месца, здаецца, варта паставіць ахоўную функцыю, карані якой ідуць у далёкія дахрысціянскія часы. Скажам, такое: на ручнік прымалі нованароджанага. Тонкі, мяккі, бялёны на сонцы, ён з’яўляўся нібы пасрэднікам паміж колішнім светам і цяперашнім, у які немаўля трапляла.

У вясковай хаце бохан хлеба заўсёды ляжаў на ручніку. Выказваючы гасцям павагу, хлеб-соль падносілі толькі на ручніку. Ручнікамі ўпрыгожвалі іконы, люстэркі, рамкі з фотакарткамі родных і блізкіх.

Ручнік характарызаваў і нявесту. Цікавячыся пасагам, сваты перш за ўсё імкнуліся паглядзець, якія ў яе ручнікі. Бо ў іх, як нідзе лепей, адлюстроўвалася ўмельства будучай гаспадыні, яе духоўны свет і, калі хочаце, яе характар.

На ручнік ставілі маладых, каб у іх была агульная дарога ў жыцці. Не чым іншым, а ручнікамі ядналі рукі жаніха і нявесты, абвязвалі тых жа сватоў, на ручніку ўзвышаўся вясельны каравай.

Калі чалавек завяршаў сваю жыццёвую дарогу, яго клалі на ручнік, ім жа і накрывалі. На ручніках апускалі труну ў магілу. Ручнік вешалі на крыж. Ручнік служыў людзям і на Радаўніцу – яго рассцілалі на магіле падчас памінальнай трапезы.

Карацей, усе этапы чалавечага жыцця праходзілі пад знакам ручніка.

Сёння без ручніка не абыходзіцца ніводная больш-менш значная выстава народнага мастацтва, бо менавіта ручнік з найбольшай яркасцю ўвасабляе нацыянальныя рысы арнаментальнага мастацтва, высокае майстэрства ткацтва, вышыўкі і вязання.

3. Прыём «Інтэрактыўны план тэксту».

*Удзельнікі майстар-класа, адсканіраваўшы QR-код праз праграму ў сваіх смартфонах, размяшчаюць пункты плана ў сэнсавай паслядоўнасці:*

| | |
|---|---|
| 1. Ахоўная функцыя ручніка.<br>2. Значэнне ручніка ў вясковай хаце.<br>3. Ручнік – духоўны свет нявесты.<br>4. Роля ручніка ў вясельным абрадзе.<br>5. Ручнік – сімвал шляху ў іншы свет.<br>6. Сучаснае жыццё ручніка. | |

*Абмеркаванне варыянтаў работы з планам.*

4. Прыём «”Тонкія” – “тоўстыя” пытанні».

*Кожны ўдзельнік майстар-класа на асобных аркушах паперы складае па тры «тонкія» пытанні.*

“Тонкія” пытанні – гэта пытанні, якія патрабуюць простага, аднаскладовага адказу, ставяцца да фактычнай інфармацыі і пачынаюцца са слоў “хто”, “што”, “які”, “дзе”, “куды” і г.д. З адваротнага боку запісваюцца адказы.

*Пасля гэтага майстар перадае ўсе пытанні адной групе. Яе ўдзельнікі зачытваюць пытанні двум гупам па чарзе. Удзельнікі дзвюх груп даюць адказы на пытанні, запаўняючы поле гульні «Крыжык-нулік». Ліст для гульні вывешваецца на дошку. Адна група за правільны адказ ставіць у полі знак крыжыка, іншая – знак нуліка.*

“Тоўстыя” пытанні – гэта праблемныя пытанні, якія патрабуюць падрабязнага, разгорнутага адказу.

*Удзельнікі кожнай групы складаюць адно тоўстае пытанне да прапанаванага тэксту*, пачынаючы пытанні наступным чынам: “Прывядзіце тры доказы таго, што…”; “Ці згодны вы з тым, што…”; “Растлумачце, чаму…” і г.д.

Дадзены прыём спрыяе развіццю мыслення і ўвагі вучняў. У вучняў развіваецца ўменне задаваць «разумныя» пытанні. Класіфікацыя пытанняў дапамагае ў пошуку адказаў, прымушае ўдумвацца ў тэкст і дапамагае лепш засвоіць змест тэксту.

5. Прыём “Крыжаванка”.

*Майстар прапаноўвае ў групах разгадаць крыжаванку* (дадатак 2).



Па вертыкалі:

1. Дзень на першым тыдні пасля Вялікадня, калі памінаюць нябожчыкаў на магілах.

2. Скрыня, у якой хаваюць нябожчыка.

3. Адшліфаваная паверхня (шкла, металу), здольная даваць адбіткі тых прадметаў, якія знаходзяцца перад ёю, а таксама спецыяльна зроблены прадмет з такой паверхняй.

4. Асоба, якая сватае жаніху нявесту ці нявесце жаніха.

Па гарызанталі:

5. Прадмет у выглядзе фігуры з дзвюх палак ці брускоў, якія перасякаюцца.

6. Малое дзіця.

7. Стол для ежы, а таксама прыём ежы і сама ежа.

8. Маёмасць, якую давалі бацькі або сваякі маладой, калі тая выходзіла замуж.

9. Жанчына, якая вядзе гаспадарку, займаецца гаспадарчымі справамі. Жонка галавы сям'і, дома.

*Правільныя адказ выводзіцца на экран, самаправерка.*

6. Прыём "Свой сярод чужых".

Для выканання наступнага задання прашу вас яшчэ раз перачытаць тэкст.

*Пасля гэтага ўдзельнікі на лістах (дадатак 3) маркерамі пазначаюць спалучэнні слоў, якія сустракаліся ў тэксце. Заданне выконваецца самастойна. Пасля выканання ўдзельнікі насупраць абменьваюцца маркерамі, на экран выводзіцца слайд з правільнымі адказамі, праводзіцца самаправерка маркерам іншага колеру.*

*Адказ.*

Ахоўніцкую функцыю; старажытныя часы; **бялёны на сонцы**; **пасрэднікам паміж колішнім светам і цяперашнім**; дзіця трапляла; у **вясковай хаце**; **выказваючы павагу**; упрыгожвалі люстры; рамкі з фотаздымкамі родных і блізкіх; **цікавячыся пасагам**; адлюстроўвалася ўменне; **агульная дарога ў жыцці**; **ядналі рукі**; узвышаўся шлюбны каравай; **клалі на ручнік; вешалі на крыж**; рассцілалі на могілках; **выстава народнага мастацтва**; увасабляе нацыянальныя рысы арнаментнага мастацтва.

Звяртаецца ўвага, напрыклад, на размежаванне паронімаў.

Арнаментны – які звязаны з арнаментам (арнаментнае пано).

Арнаментальны – 1. Які з'яўляецца арнаментам; складаецца з арнаменту (арнаментальны роспіс). 2. Пышны, вычварны; багаты на ўпрыгожанні (арнаментальны стыль).

8. Абмеркаванне заданняў для ацэнкі функцыянальнай пісьменнасці вучняў (дадатак 4).

**IV. Падвядзенне вынікаў майстар-класа.**

Ужываючы ў педагагічнай дзейнасці дадзеныя і іншыя прыёмы работы з тэкстам, адзначаю наступныя змены:

вучні вучацца слухаць адзін аднаго, нясуць адказнасць за сумесны спосаб пазнання;

павялічваецца інтэлектуальны патэнцыял вучняў, пашыраецца іх слоўнікавы запас;

сумесная праца спрыяе лепшаму разуменню цяжкага, інфармацыйна насычанага тэксту;

выпрацоўваецца павага да ўласных думак;

абвастраецца дапытлівасць, назіральнасць;

павялічваецца самаацэнка.

Усё гэта садзейнічае павышэнню чытацкіх уменняў і фарміраванню чытацкай пісьменнасці вучняў.

**V. Рэфлексія.**

Рэфлексію правядзём, выкарыстоўваючы прыём «Сінквейн» з ключавымі словам "РУЧНІК", "ПІСЬМЕННАСЦЬ", "ТЭКСТ". Кожная група складае свой сінквейн. Агучваюцца вынікі дзейнасці.

І на прыканцы майстар-класа паглядзіце на азбуку беларускага арнаменту *(выведзена на слайд, а таксама знаходзіцца на сталах)*, выберыце той сімвал, які дапаможа выказаць пажаданні ўсім прысутным, агучце іх і прымацуйце да ручніка, які размешчаны на дошцы.

Дзякую ўсім за ўдзел у майстар-класе. Спадзяюся, што маё выступленне было для вас карысным. А практычны матэрыял сённяшняга майстар-класа змешчаны за QR-кодамі вось на гэтых ручнічках.

*Усе ўдзельнікі атрымліваюць практычны матэрыял.*

**Дадатак 1**

Беларускі ручнік

У жыцці нашага народа ручнік выконваў шмат функцый.

На першае месца, здаецца, варта паставіць ахоўную функцыю, карані якой ідуць у далёкія дахрысціянскія часы. Скажам, такое: на ручнік прымалі нованароджанага. Тонкі, мяккі, бялёны на сонцы, ён з’яўляўся нібы пасрэднікам паміж колішнім светам і цяперашнім, у які немаўля трапляла.

У вясковай хаце бохан хлеба заўсёды ляжаў на ручніку. Выказваючы гасцям павагу, хлеб-соль падносілі толькі на ручніку. Ручнікамі ўпрыгожвалі іконы, люстэркі, рамкі з фотакарткамі родных і блізкіх.

Ручнік характарызаваў і нявесту. Цікавячыся пасагам, сваты перш за ўсё імкнуліся паглядзець, якія ў яе ручнікі. Бо ў іх, як нідзе лепей, адлюстроўвалася ўмельства будучай гаспадыні, яе духоўны свет і, калі хочаце, яе характар.

На ручнік ставілі маладых, каб у іх была агульная дарога ў жыцці. Не чым іншым, а ручнікамі ядналі рукі жаніха і нявесты, абвязвалі тых жа сватоў, на ручніку ўзвышаўся вясельны каравай.

Калі чалавек завяршаў сваю жыццёвую дарогу, яго клалі на ручнік, ім жа і накрывалі. На ручніках апускалі труну ў магілу. Ручнік вешалі на крыж. Ручнік служыў людям і на Радаўніцу – яго рассцілалі на магіле падчас памінальнай трапезы.

Карацей, усе этапы чалавечага жыцця праходзілі пад знакам ручніка.

Сёння без ручніка не абыходзіцца ніводная больш-менш значная выстава народнага мастацтва, бо менавіта ручнік з найбольшай яркасцю ўвасабляе нацыянальныя рысы арнаментальнага мастацтва, высокае майстэрства ткацтва, вышыўкі і вязання.

**Дадатак 2**




**Па вертыкалі:**

1. Дзень на першым тыдні пасля Вялікадня, калі памінаюць нябожчыкаў на магілах.
2. Скрыня, у якой хаваюць нябожчыка.
3. Адшліфаваная паверхня (шкла, металу), здольная даваць адбіткі тых прадметаў, якія знаходзяцца перад ёю, а таксама спецыяльна зроблены прадмет з такой паверхняй.
4. Асоба, якая сватае жаніху нявесту ці нявесце жаніха.

**Па гарызанталі:**

5. Прадмет у выглядзе фігуры з дзвюх палак ці брускоў, якія перасякаюцца.
6. Малое дзіця.
7. Стол для ежы, а таксама прыём ежы і сама ежа.
8. Маёмасць, якую давалі бацькі або сваякі маладой, калі тая выходзіла замуж.
9. Жанчына, якая вядзе гаспадарку, займаецца гаспадарчымі справамі. Жонка галавы сям'і, дома.

Адказы



**Дадатак 3**

Ахоўніцкую функцыю; старажытныя часы; бялёны на сонцы; пасрэднікам паміж колішнім светам і цяперашнім; дзіця трапляла; у вясковай хаце; выказваючы павагу; упрыгожвалі люстры; рамкі з фотаздымкамі родных і блізкіх; цікавячыся пасагам; адлюстроўвалася ўменне; агульная дарога ў жыцці; ядналі рукі; узвышаўся шлюбны каравай; клалі на ручнік; вешалі на крыж; рассцілалі на могілках; выстава народнага мастацтва; увасабляе нацыянальныя рысы арнаментнага мастацтва.

**Дадатак 4**

1. Выберыце сцверджанне, якое не адпавядае інфармацыі, пададзенай у тэксце.

1) Ручнікамі ўпрыгожвалі іконы, люстэркі, рамкі з фотакарткамі родных і блізкіх.

2) У вясковай хаце бохан хлеба заўсёды ляжаў на ручніку.

3) Ручнік не прысутнічаў на провадах чалавека ў апошні шлях.

Запішыце нумар гэтага сцверджання:

☐

2. Выберыце сцверджанні, якія адпавядаюць інфармацыі, пададзенай у тэксце.

1) Ручнік адлюстроўваў духоўны свет нявесты, яе характар.

2) Сваты не імкнуліся паглядзець ручнікі нявесты.

3) Ручнікамі ядналі рукі жаніха і нявесты.

4) Вясельны каравай заўсёды ўзвышаўся на ручніку.

Запішыце нумары гэтых сцверджанняў:

___________________________________

3. Як называлася маёмасць, якую давалі бацькі або сваякі маладой, калі тая выходзіла замуж.

1) труна;

2) люстра;

3) пасаг;

4) вышыўка.

Адказ запішыце лічбай:

☐

5. Устанавіце адпаведнасць паміж словамі і іх лексічнымі значэннямі.

| | |
|---|---|
| А. Сват<br>Б. Немаўля<br>В. Гаспадыня<br>Г. Радаўніца | 1. Малое дзіця.<br>2. Жанчына, якая вядзе гаспадарку, займаецца гаспадарчымі справамі. Жонка галавы сям'і, дома.<br>3. Асоба, якая сватае жаніху нявесту ці нявесце жаніха.<br>4. Прадмет у выглядзе фігуры з дзвюх палак ці брускоў, якія перасякаюцца.<br>5. Дзень на першым тыдні пасля Вялікадня, калі памінаюць нябожчыкаў на магілах. |

Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

_______________________________________

5. Прыдумайце тры пытанні да тэксту, якія пачынаюцца са слоў «што», «каго», «дзе».

Што______________________________________________________________?

Каго______________________________________________________________?

Дзе_______________________________________________________________?

6. Абапіраючыся на тэкст, запішыце па адным сказе, выкарыстоўваючы словы «павага», «характар», «крыж».

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

____________________________________________________________.

6. Разгледзьце фотаздымак і адкажыце на пытанне: «У якім абрадзе і сёння прысутнічае ручнік»?



1) уваходзіны;
2) вяселле;
3) радзіны;
4) сватанне.

Адказ запішыце лічбай:

☐

8. Прывядзіце тры доказы таго, што ручнік суправаджаў чалавека на працягу ўсяго жыцця.

______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
____________________________________________________________.

9. Кожную апошнюю сераду месяца вучні нашай рэспублікі маюць магчымасць бясплатнага наведвання гэтых месцаў. Менавіта там сёння можна ўбачыць лепшыя ўзоры ручнікоў. Здагадайцеся, пра якое месца ідзе гаворка. Адказ запішыце аднасастаўным сказам.

______________________________________________________________________
____________________________________________________________________.

10. Складзіце і запішыце інструкцыю з 3-4 пунктаў «Паводзіны ў музеі».

______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________.

## Саюз аднадумцаў
## "Новыя прафесійныя магчымасці з анлайн-школай для філолагаў"

Купрацэвіч Вольга Васільеўна,
настаўнік рускай мовы і літаратуры,
кіраўнік раённай анлайн-школы для філолагаў ДУА "Сярэдняя школа №11 г.Светлагорска"

З 2023 года ў Беларусі праводзіцца нацыянальнае даследаванне якасці адукацыі, накіраванае на дыягностыку сфарміраванасці функцыянальнай адукаванасці вучняў.

Фарміраванне ў вучняў функцыянальнай адукаванасці сродкамі вучэбнага прадмета прадугледжвае развіццё здольнасцей выкарыстоўваць набытыя веды, уменні і навыкі для вырашэння шырокага дыяпазону жыццёвых задач у розных сферах дзейнасці, зносін і сацыяльных адносін.

Працэс фарміравання функцыянальнай адукаванасці патрабуе ад настаўніка выкарыстоўваць метады і прыёмы навучання, якія дазваляюць развіваць ініцыятыўную, самастойную і творчую асобу.

Згодна з адукацыйнымі стандартамі агульнай сярэдняй адукацыі, сярод чаканых вынікаў адукацыі – навучэнец, які праяўляе цікавасць да творчай дзейнасці пошуку нестандартных рашэнняў; які валодае прыёмамі вучэбна-

даследчай і праектнай дзейнасці; гатовы да выканання сацыяльна значных праектаў з выкарыстаннем сучасных інфармацыйных тэхналогій.

Сярод мэт адукацыі – фарміраванне камунікатыўнай і інфармацыйна-камунікацыйнай кампетэнцый вучняў, каштоўнасных адносін да творчасці і інавацый на аснове выкарыстання асабістага і сацыяльнага, назапашвання новага вопыту пазнавальнай дзейнасці. Дасягненню гэтых мэтаў будзе спрыяць развіццё ўменняў ствараць аўтарскі адукацыйны кантэнт.

Стварэнне адукацыйнага кантэнту, адзначана ў новым ІМП, у рамках арганізацыі праектнай дзейнасці навучэнцаў, будзе спрыяць выхаванню творчай, актыўнай, дзейнаснай асобы. У гэтым жа дакуменце чытаем пра асобу педагагічнага работніка, які сваім асабістым прыкладам павінен выхоўваць навучэнцаў.

Практычная рэалізацыя прапанаваных у нарматыўных дакументах напрамкаў па выкарыстанні ІКТ, фарміраванні асабістага прыкладу кампетэнтнага ў стварэнні адукацыйнага кантанта педагога знайшла адлюстраванне ў распрацоўцы і стварэнні раённага сайта.

Анлайн-школа для філолагаў – праект аднадумцаў, які аб'яднаў творчых педагогаў Светлагорскага раёна. Сайт “Экзамен-ЦЭ” створаны для настаўнікаў і навучэнцаў па падрыхтоўцы да іспытаў, алімпіяд і конкурсаў па беларускай мове і літаратуры, рускай мове і літаратуры.

Ідэя стварэння сайта належыць профільнаму метадысту ДУ “Светлагорскі РУМК” Новік Вользе Васільеўне. З 2022 года на старонках сайта з'яўляюцца публікацыі з вопыту работы настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры.

“Экзамен-ЦЭ” змяшчае разнастайныя рубрыкі. Для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры карыснымі будуць наступныя раздзелы ў рубрыцы “Бел. мова”:

“Без памылак”
“Вопыт філолагаў”,
“Кантэкстуальныя заданні”,
“Карткі”,
“Комплексныя задані”,
“Методыка”,
“Памяткі”,
“Правапіс”,
“Сінтаксіс і пунктуацыя”,
“Тэсты”,
“У дапамогу”.

Публікацыі змяшчаюць актуальную інфармацыю, матэрыялы з вопыту работы, прэзентацыі, тэксты, алгарытмы, тэсты, трэнажоры, табліцы, схемы, памяткі і інш., у артыкулах пазначаны аўтары і ўстанова адукацыі, ёсць спасылкі на запампоўку электронных версій апублікаваных матэрыялаў.

Так, у рубрыцы “Вопыт філолагаў” – матэрыялы з вопыту работы настаўнікаў раёна па падрыхтоўцы да ЦЭ па беларускай мове: Анацка Ірыны Фёдараўны, настаўніка беларускай мовы і літаратуры ДУА “Каранеўская

сярэдняя школа Светлагорскага раёна”, Корбут Алены Вячаславаўны, настаўніка беларускай мовы і літаратуры ДУА “Пячышчанская сярэдняя школа” і інш.

Публікацыі, падрыхтаваныя профільным метадыстам Новік В.В., дапамагаюць педагогам якасна рыхтавацца да ўрокаў. Так, напрыклад, матэрыял “Дыягнастычныя самадыктанты для вучняў 9-11 класаў” змяшчае прыклады самадыктантаў па жыцці і творчасці беларускіх пісьменнікаў, якія можна выкарыстоўваць на ўроках беларускай мовы і літаратуры ў тым ліку для рэалізацыі выхаваўчых задач па патрыятычным выхаванні.

Публікацыя “Прадухіленне тыповых памылак і цяжкасцей навучэнцаў пры засваенні зместу праграмы па беларускай мове” змяшчае пералік літаратуры для падрыхтоўкі да іспыту па беларускай мове і літаратуры, пералік складаных тэм. Тэкст артыкула быў падрыхтаваны кіраўнікам РМА, настаўнікам беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі ДУА “СШ№10 г.Светлагорска імя С. Л. Краснаперава”, абласным трэнерам Лявоненка С.У.

Настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА “Сярэдняя школа №11 г. Светлагорска” І. Г. Храмцова прадставіла карткі па складаных тэмах арфаграфіі для работы па падрыхтоўцы да ЦЭ: “Прыстаўныя галосныя”, “Правапіс ‘ або Ь”, “Правапіс Й, Ы, І”, “Правапіс А, О, Е, Ё, Я, Ы”.

Публікацыі “Комплексныя заданні”, “Кантэкстуальныя заданні" змяшчаюць дыягнастычны матэрыял для кантролю ведаў вучняў па вывучаных тэмах і адпавядаюць кампетэнтнаснаму падыходу.

Ёсць на старонках сайта памяткі, распрацаваныя з выкарыстаннем прыёмаў візуалізацыі і гумарыстычных каментарыяў (“Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам”). Аб'яднанне сур'ёзнай тэарэтычнай інфармацыі і гумару садзейнічае паскарэнню запамінання і павышэнню матывацыі да навучання.

Серыя прэзентацый па тэме “Сінтаксіс і пунктуацыя” можа быць выкарыстана настаўнікам для арганізацыі самастойнай работы вучняў па тэмах “Словы-сказы", “Словазлучэнне”, “Складаназлучаныя сказы”. Падача матэрыялу ў выглядзе яркіх схем дапаможа навучэнцам сістэматызаваць тэарэтычную інфармацыю.

Модулі з тэстамі па тэмах “Канчаткі дзеясловаў”, “Канчаткі назоўнікаў”, “Правапіс падоўжаных зычных” і інш. змяшчаюць уваходныя тэсты, табліцы, “белыя плямы”, лічбавыя дыктоўкі, кантрольныя тэсты па тэмах.

Разнастайны матэрыял, створаны настаўнікамі і іх навучэнцамі, апублікаваны на старонках сайта “Экзамен-ЦЭ”, можа быць выкарыстаны для працы на ўроках і ў пазаўрочны час. Даступнасць матэрыялаў забяспечваецца наяўнасцю на кожнай старонцы кнопкі “Спампаваць”. Зразумелы інтэрфейс, прастата навігацыі, разнастайныя рубрыкі і лагічна арганізаваныя артыкулы сайта робяць яго зручнай сучаснай пляцоўкай для публікацыі матэрыялаў з вопыту работы.

Анлайн-школа – скарбонка карыснай інфармацыі, практычных матэрыялаў. Яна дае магчымасць узаемадзейнічаць з навучэнцамі і педагогамі з розных рэгіёнаў, спрыяе распаўсюджванню апрабаванага адукацыйнага кантэнту. Матэрыялы з вопыту работы не пыляцца на паліцах у шафах навучальных кабінетаў, а прыносяць карысць тым, хто мае патрэбу ў іх. “Заўтра

належыць тым, хто рыхтуецца да яго сёння”. Вось чаму важна навучыцца развівацца ў дынамічным свеце і выкарыстоўваць лічбавыя тэхналогіі для стварэння адукацыйнага кантэнту. Альберт Эйнштэйн пісаў: “Галоўнае – не пераставаць задаваць пытанні. Цікаўнасць не выпадкова дадзена чалавеку”.

У рамках прэзентацыі анлайн-школы хочацца расказаць аб новым дапаможніку Н.І. Запрудскага – кнізе “Будуем навучанне на пытаннях”. У дапаможніку дадзена класіфікацыя пытанняў, раскрываюцца асаблівасці розных іх тыпаў, прадстаўлена практыка прымянення настаўніцкіх пытанняў для развіцця ў вучняў функцыянальнай пісьменнасці, для ўключэння ў дзейнасць па фармуляванню пытанняў навучэнцаў і іх бацькоў.

Кніга змяшчае 4 раздзелы:

1. Пытанні як найважнейшы сродак навучання.
2. Дзейнасць настаўніка па складанні пытанняў.
3. Ўцягванне вучняў у практыку фармулявання пытанняў.
4. Бацькі як суб'екты запытання.

Дапаможнік Н.І. Запрудскага знаёміць з правіламі пастаноўкі пытанняў, з тым, якія пытанні дапамагаюць развіваць чытацкую пісьменнасць, праектныя і даследчыя кампетэнцыі, крытычнае мысленне, творчыя, камунікатыўныя, кааператыўныя здольнасці.

Пытанні – паліва развіцця, а ўменне задаваць пытанні – магчымасць адкрываць для сябе новыя грані свету. Толькі задаючы пытанні, чалавек развіваецца.

Вельмі важна не пераставаць задаваць пытанні, працягваць развівацца самім і садзейнічаць развіццю сваіх вучняў, іх бацькоў, калег.

Настаўніку самому важна развіваць уласныя здольнасці, веды, ўменні і навыкі для вырашэння жыццёвых задач у розных сферах дзейнасці. Каб развіваць у навучэнцаў функцыянальную пісьменнасць, трэба самому ёю валодаць. Для гэтага варта праяўляць ініцыятыву, самастойнасць і творчасць.

Анлайн-школа аб'ядноўвае аднадумцаў, якія шукаюць магчымасці, а не прычыны, адкрывае новыя прафесійныя магчымасці, пашырае гарызонты для самарэалізацыі і праявы творчых здольнасцяў.